Бальшавік

...сі

1928 № 4-7

Бальшавік Беларусі

№ 4

КРАСАВІК

МЕНСК 1928

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ

ЧАСОПІСЬ ПАЛІТЫКІ І ПРАКТЫКІ
ПАРТЫЙНАЙ ПРАЦЫ
ОРГАН ЦК КП(б)Б

№ 4
КРАСАВІК

МЕНСК — 1928

Надрукавана ў 2-й друкарні-
літографіі Беларускага
Дзяржаўнага Выд-ва.
Галоўлітбел 1124.
У ліку 1000 экз.
Заказ № 2143.

Аксючыц

Задачы сельска-гаспадарчай капэрацыі ў сувязі з пастановамі XV-га Зьезду ЎсеКП

XV-ты зьезд Усесаюзнай камуністычнай партыі ў сваёй пастанове аб працы на вёсцы па дакладу тав. Молатава гаворыць наступнае:

„Пашырыць і ўзмацніць сетку капэрацыі, маючы на ўвазе ўцягненьне ў капэрацыю на працягу бліжэйшага пэрыяду ўсе беднiцкія і большасьць серадняцкіх гаспадарак, павялічыўшы фонд капэраваньня беднаты. А ў другой сваёй пастанове ў дырэктывах па складаньню пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі зьезд гаворыць: „Асаблівая ўвага павінна быць аддадзена капэрацыі; перад ёю стаіць задача большага ахопу ўсё большых колаў насельніцтва, капэрацыя павінна стаць найбольш танным апаратам па прасоўваньню тавараў ад вытворца да спажыўца і праз арганізаванае ўцягненьне мас у гаспадарчую працу, яна павінна садзейнічаць вучоту спажывецкага попыту насельніцтва і плянаваму здавальненьню гэтага попыту шляхам своечасовага заказу прамысловасьці тых тавараў вытворчасьці, на якія ёсьць попыт".

У сувязі з гэтымі дырэктывамі і з тэй плянавай працай па разьвіцьцю нашае народнае гаспадаркі, якую вядзе наш савецкі ўрад, капэрацыя наогул, а сельска-гаспадарчая ў яшчэ большай ступені набывае вельмі вялікае значэньне, па плянаваму разьвіцьцю сельскае гаспадаркі і сувязі яе з прамысловасьцю. Выходзячы з гэтага, усе арганізацыі як урадавыя, гэтак і прафэсыянальныя, грамадзкія і інш. павінны прыняць усе меры для паляпшэньня працы сельска-гаспадарчай капэрацыі. А з другога боку, і сам капэрацыйны апарат павінен яскрава ўявіць сабе тую адказнасьць, якая на яго гэтымі пастановамі ўскладзена, больш адчуваць гэту адказнасьць, выяўляць больш уважлівасьці да той працы, якую ён праводзіць.

Каб уявіць сабе больш яскрава гэтыя задачы, мы падамо некалькі лічбаў аб становішчы ў сучасны момант с.-г. капэрацыі, і спрабуем накінуць у кароткіх рысах тыя мерапрыемствы, якія патрэбна на бліжэйшы час правесьці для далейшага разьвіцьця і паглыбленьня працы с.-г. капэрацыі. Пры чым сыстэму с.-г. капэрацыі трэба разглядаць ня толькі як тавараправодную сетку, што робяць некаторыя працаўнікі некаторых установаў і што зьяўляецца вялікай памылкай, а разглядаць больш за ўсё з боку вытворчага. Заўсёды пры разглядзе працы с.-г. капэрацыі трэба мець гэта на ўвазе, і тады будзе зразумела тая складаная задача, якая стаіць перад с.-г. капэрацыяй.

Па справаздачных матар'ялах сыстэма с.-г. капэрацыі к канцу 1926-27 апэрацыйнага году ўяўляе з сябе наступнае:

Рост сеткі па гадох

Гады	Лік усіх капэратываў	% прыросту к папярэдн. году	З іх: вытворчых аб'яднаньняў	З іх: % прыросту папяр. гад.	Удзельная вага вытв. аб'яднан. у сетцы
На 1/X—1924 г.	849	100	90	100	10,6
„ 1/X—1925 г.	945	111,2	167	185,5	17,6
„ 1/X—1926 г.	1013	107,2	285	164,7	27.1
„ 1/X—1927 г.	1273	125,6	582	211,6	45,7

Прыведзеныя лічбы гавораць, што пры параўнаўча невялікім штогадовым прыросьце агульнага ліку нізавых аб'яднаньняў, прырост вытворчых капэратываў ідзе досыць шпаркім тэмпам. Так у 1924-25 годзе ўся сетка павялічылася толькі на 11,2%, а вытворчыя капэратывы на 85,5%, прыкладна такі самы малюнак наглядаецца і ў наступныя гады. Удзельная вага спэцыяльнае сеткі з 10,6% у 1924 г. узрасла к 1-му кастрычніку 1927 г. да 45,7%; рост вытворчых аб'яднаньняў адбываецца галоўным чынам за рахунак малочнай капэрацыі, машынных і мэліарацыйных таварыстваў. Па гадох агульны лік вытворчых аб'яднаньняў с.-г. капэрацыі, які нас цяпер больш за ўсё цікавіць, рос вельмі шпарка, што відаць на табліцы. Па асобных відах і па акругах мы маем наступныя лічбы:

Віды аб'яднаньняў	Бабруйская	Менская	Віцебская	Магілеўская	Мазырская	Аршанская	Полацкая	Гомельская	Усяго
Малочныя арцелі	29	25	20	21	16	15	6	14	156
Пчалаводн. т-вы	6	1	—	14	3	3	—	1	28
Садова-гародн.	4	1	3	24	—	3	1	1	37
Бульбян.-цёрачн.	1	—	—	—	—	—	—	—	1
Ільнаводныя	—	—	—	—	—	—	1	—	1
Агнятрывал. буд.	2	—	—	19	—	5	—	8	34
Мэліар.-тарпян.	1	1	13	17	—	51	4	46	133
Машынныя	7	8	3	14	4	11	5	31	86
Жывёлаводныя	2	4	1	10	—	2	3	1	23
Кантрольныя	2	1	—	2	—	—	5	—	10
Насеннаводныя	6	3	3	7	2	—	1	—	22
Рыбалоўныя	4	—	—	—	—	2	7	—	13
Куст.-прамыслов.	—	—	—	—	—	1	5	8	14
Іншыя	6	—	1	—	—	4	3	10	24
Разам	70	44	44	141	25	97	41	120	582

Паказаныя лічбы гавораць аб тым, што вытворчыя віды аб'яднаньняў растуць больш шпаркім тэмпам, чым усе іншыя, а гэта гаворыць пра правільны напрамак арганізацыйнай працы капэрацыі; пры тым у гэтыя лічбы не ўваходзяць калгасы, якія маюць сёньня 416 адзінак. Калі мы зьвернем увагу на лік аб'яднаньняў па кожнай акрузе, дык і па агульнаму чыслу аб'яднаньняў і па асноўных іх відах (малочныя арцелі, машынныя таварыствы, мэліарацыйныя, жывёлаводныя і інш.) на першым мейсцы стаяць акругі: Магілеўская, Гомельская, Аршанская і Бабруйская. Ва ўсіх астатніх акругах сетка вытвор-

чых капэратываў у параўнаньні з паказанымі разьвіта слаба, асабліва гэта трэба аднесьці Віцебскай і Менскай, эканоміка якіх дазваляла працу па вытворчаму капэраваньню насельніцтва павесьці больш шырока. Калі мы далей паглядзім узрост капэраванага насельніцтва, дык убачым наступную карціну:

Гады	Усяго капэравана сялян. гаспадарак	% агульн. ліку гасп. БССР	З і х					
			Капэравана праз с.-г. і кр. т-вы	% узросту к папярэдн. году	% капэрав. к агульнаму ліку гасп.	Капэравана праз вытв. аб'яднан.	Узрост у %	% капэрав. к агульнаму ліку гаспадарак
На 1/X-24	48074	6.04	38128	100	4.8	9946	100	1.24
„ 1/X-25	122230	15.34	108653	184.9	13.7	13577	136 5	1.64
„ 1/X-26	201721	25.32	183283	168.6	23.0	18438	135 8	2.32
„ 1/X-27	285696	35.87	252342	137.7	31.7	33354	182.3	4.17

Працэс вытворчага капэраваньня з кожным годам усё расьце, але гэты ўзрост у параўнаньні з крэдытнай сеткай зьяўляецца нязначным. У мінулым 1927 г. яно дало больш прыметны вынік, які аднак належыць не да ўсіх відаў вытворчых аб'яднаньняў, а галоўным чынам, да малочнай капэрацыі. Апошняя за 1927 год мела досыць шпаркі рост; гэтак на 1-е кастрычніка—27 г. з агульнага ліку пайшчыкаў 33.354 капэраваных у вытворчых капэратывах на долю малочных арцеляў выпадае 11.331 гаспадарка, або 34%, але наогул вытворчымі відамі капэрацыі мала капэравана сялянскіх гаспадарак і склад саміх таварыстваў яшчэ надзвычайна дробны; сярэдняя лічба пайшчыкаў на 1 аб'яднаньне выражаецца у: малочнай арцелі—73 гасп., машынным таварыстве—14, жывёлаводным—28, насеннаводным—47, мэліярацыйным—63, пчалаводным—42 і г. д. Гэта гаворыць аб тым, што вытворчыя капэратывы пакуль што ня носяць масавага характару і што праца па вытворчаму капэраваньню да гэтага часу не зьяўлялася ў нас галоўнай, а больш зьвярталася ўвагі на сетку с.-г. крэдытных. У выніку таго, што вытворчымі аб'яднаньнямі капэравана мала сялянскіх гаспадарак і сацыяльны склад іх пайшчыкаў зьяўляецца горшым чым у крэдытным, калі ў с. г. крэдытных таварыствах па тых статыстычных даных, якія мы маем, процант беднаты складае больш 40, дык у спэцыяльных відах аб'яднаньняў ён мае ў сярэднім ня больш 20; гэта гаворыць аб тым, што мы дасюль не зьвярталі належнай увагі на капэраваньне сельскай гаспадаркі вытворчымі відамі капэрацыі, бо лік саміх капэрацыйных адзінак гаворыць аб вялікай зацікаўленасьці насельніцтва ў вытворчых відах капэрацыі.

Да гэтага часу яшчэ многа капэрацыйных адзінак не ўваходзяць у сыстэму с.-г. капэрацыі членамі. Гэта тлумачыцца тым, што цэлы шэраг вытворчых капэрацыйных аб'яднаньняў як, напрыклад, мэліярацыйныя таварыствы хоць і зьяўляюцца вельмі патрэбнымі з боку гаспадарчага падняцьця сельскай гаспадаркі, але па сваёй гаспадарчай дзейнасьці яны вельмі мала зьвязаны з сыстэмай капэрацыі. Усе тыя капэратывы, а разам і мэліярацыйныя таварыствы, якія зьяўляюцца гаспадарча-жыцьцёвымі, саюзы абавязаны ўцягнуць у сыстэму

і ўзяць пад сваё абслугоўваньне, а дзяржава павінна дапамагчы сродкамі на ўтрыманьне інструктарскага апарату для абслугоўваньня гэтых відаў аб'яднаньняў. Шмат з іх, асабліва мэліярацыйныя таварыствы, працуюць дрэнна, альбо і зусім да працы не прыступілі, а лічацца толькі на паперы. Гэткія капэратывы трэба зусім ліквідаваць бо яны ўтвораны без усялякай эканамічнай падставы і зьяўляюцца не патрэбнымі, да і к таму яшчэ атрымліваюць крэдыт, гэты крэдыт неправідлова скарыстоўваюць і ёсьць небясьпека нават ці зьвярнуць яго.

Калі мя цяпер зьвернемся да гаспадарчай дзейнасьці паасобных відаў пярвічнай капэрацыі, дык заўважым, што сельска-гаспадарчая крэдытная сетка, якая зьяўляецца эканамічна самай моцнай і вядзе самую большую працу ў сыстэме с.-г. капэрацыі ў сваім звароце мела суму выдадзеных ссуд у 1925-26 г. 5.948.000 руб у той час як 1926-27 г. гэта сума павялічылася да 10.946.000 руб., снабжэнцкія апэрацыі— у 1925-26 г. складалі 4.961.000 руб., а ў 1926 27 г. 7.432.000 р., збытавыя апэрацыі—у 1925-26 г. складалі суму 3.247.000 р., а ў 1926-27 г., 5.043.000 р., увесь-жа зварот у 1925-26 г. складаў 14.157.000 р. з павялічэньнем у 1926-27 да 22.723.000 руб.

З пададзеных даных відаць, што аб'ём апэрацый на 1926-27 апэрацыйны год павялічыўся супроць апэрацыі 1925-26 года на 61%.

Наступны від капэрацыі па сваёй гаспадарчай сілкасьці гэта малочныя арцелі, уся сетка малочных арцеляў у ліку 156 адзінак у пачатку бягучага году мела 177 заводаў па пераапрацоўцы малочнай прадукцыі. Весткі-ж па характэрыстыцы работ маюцца толькі па 118 арцелях і па належачых ім 92 заводах, па ўказанным арцелям паступіла за год малака 8.623.000 кгр. на суму 724.000 р. з гэтай колькасьці прадана цэльным малаком 2.319.000 кгр. на суму 258.000 р. і перапрацавана на масла і сыр 6.303.000 кгр. на суму 465.000 р. Па ўдзельнай вазе ў агульным звароце малака першае мейсца займае Менская акруга, потым Віцебская, далей Магілеўская і Гомельская, па нагрузцы-ж на адну арцель на першым мейсцы стаяць Віцебская і Менская акругі і потым Мазырская і Гомельская. Не гаворачы ўжо аб тым, што і ў гэтых саюзах нагрузка малаком арцеляў ня поўная для нармальнай іх работы, і надзвычайна нізкая ў саюзах Бабруйскім, Аршанскім і Полацкім, у цэльным відзе рэалізацыя малака складае 27%, астатняя пушчана ў пераапрацоўку; найбольш шырока разгорнута праца па цэльнаму малаку ў вакругах Менскай і Гомельскай, некалькі слабей у Віцебскай і Бабруйскай і амаль што зусім адсутнічае ў Полацкай і Мазырскай.

Надта ненармальнае зьявішча наглядаецца ў рабоце арцеляў Віцебскай акругі, дзе з 2.943 капэраваных сялянскіх гаспадарак здавалі арцелям малако толькі 1.504 гаспадаркі, або 51% і гэта пры тэй умове, што ў складзе капэраваных гаспадарак мелася бескароўных усяго 26 двароў. Пераапрацоўка малака вядзецца на заводах самага прымітыўнага тыпу, слаба абсталяваных і прыстасаваных да працы, і толькі ў 18 арцелях па БССР маюцца заводы больш буйнага і ўдасканаленага характару; сярэдняя каштоўнасьць абсталяваньня аднаго заводу дасягае 1200—1300 р., сярэдняя каштоўнасьць літра малака па ўсіх акругах роўна 8, 3 кап.

Як агульнае зьявішча, па ўсіх акругах адчуваецца недахват кваліфікаваных масларобаў і сыраватаў, а таксама адсутнічаюць у насельнільцтве неабходны вопыт у даглядзе за малаком і ў дастаўленьні яго арцелям у належным відзе. Дзякуючы гэтаму, якасьць пераапрацоўваемых прадуктаў, асабліва сыру, яшчэ нізкая. Лепшая прадукцыя ў тых акругах, дзе малочная вытворчасьць пачала разьвівацца ў апошнія часы (Аршанская і Менская акругі), з старых акруг па якасьці

прадуктаў (сыроў) на першым мейсцы стаіць Магілеўскі Саюз, па асобных акругах якасьць сырнай прадукцыі характэрызуецца наступнымі паказацелямі: Бабруйская—1 с.—60%, 2 с.—40%, Віцебская—1 с.—60%, 2 с.—40%, Менская—1 с.—80%, 2 с.—20%, Магілеўская—1 с.—75%, 2 с.—25%, Аршанская—1 с. 80%, 2 с.—20% і быўшая Слуцкая—1 с.—20%, 2 с.—50, 3 с.—30%. Дзеля таго каб палепшыць якасьць працаўнікоў, а разам з гэтым і прадукцыі, Белсельсаюзам былі праведзены курсы на 184 асобы; курсы праводзіліся на сродкі Белсельсаюза, Акрсельсаюзаў, Наркамзема, Белсельбанка і патраты на іх склалі круглую суму—4.800 руб.

Інструктароў па абслугоўваньню малочнай сеткі недастаткова; к пачатку 1926-27 г. іх было 8 чалавек к канцу—9, пры наяўнасьці 156 арцеляў, ня лічачы заводаў пры калгасах і с.-г. крэдытных таварыствах. Агрыкультурныя мерапрыёмствы як, напрыклад, уцяпленьне хлявоў, палепшаньне жывёлы, рацыянальнае кармленьне і інш., як масавае зьявішча пакуль што не ўкаранілася ў практыку работы арцеляў, хоць у асобных выпадках маюцца і ў гэтай адносіне ў некаторых аб'яднаньнях значныя дасягненьні. Так у Бабруйскай акрузе ў Росаўскай арцелі ўцеплена хлявоў у пайшчыкаў на 30% капэрыраваных гаспадарак, зроблена кармушак 13%, палепшана кармленьня 17%, пашырана пасяўная плошча бульбы на 30%.

Ня гледзячы на паказаныя недахопы ў рабоце, апошняя дала ўсётакі значныя эканамічныя эфэкты, па ўсіх акругах прыходзіцца сярэдняга валавога даходу на адну карову ад продажу лішкаў малака 35 р. 60 к. у год, якая сума зьяўляецца ў гэтай адносіне дастаткова паказальнай.

Машынныя т-вы ў нас у БССР зьяўляюцца яшчэ вельмі маладымі арганізацыямі, больш шырока арганізоўвацца яны сталі толькі з мінулага году і працуюць яшчэ пакуль што слаба, склад машын знаходзячыхся ў іх паказвае, што яны карыстаюцца пераважна прасьцейшымі машынамі. Больш складаныя машыны ў іх яшчэ не прымяняюцца; нават прасьцейшымі машынамі таварыствы забясьпечаны недастаткова, такія, напрыклад, усюды распаўсюджаныя машыны як малатарні, веялкі і спрунжыноўкі маюцца не ва ўсіх таварыствах, сярэдняя каштоўнасьць набору машын выражаецца ў суме 407 руб. на таварыства. Паміж тым каштоўнасьць машын для больш, ці менш поўнага абслугоўваньня патрэб сельскай гаспадаркі на адно таварыства павінна быць прыкладна ў 1.500 руб.

Нагрузка машын работай надзвычайна слабая, так па 11 машынных таварыствах Магілеўскае акругі мы маем наступнае: 6 малатарань працавалі ўсяго 90 дзён, гэта значыць на 1 малатарню прыходзіцца 15 рабочых дзён, 4 веялкі працавалі 42 дні, 4 саламарэзкі—27 дзён. Па Віцебскай акрузе на 1 малатарню прыходзіцца 7 рабочых дзён, а на веялку 14. У Бабруйскай акрузе на 1 малатарню—13 рабочых дзён, на 1 веялку—15. Карыстаньне машынамі амаль што выключна індывідуальнае, абагульваньне і заворваньне пасеваў, або збор ураджаю ня мелі мейсца. Былі выпадкі, што такія машыны, як саламарэзкі, плугі і спрунжыноўкі т-вы выдавалі асобным пайшчыкам ва ўласнасьць у парадку крэдытаваньня. Па справаздачах Наркамзему на 1-е кастрычніка 1927 г. у БССР налічвалася 830 мэліярацыйных таварыстваў. З указанага ліку таварыстваў лічацца членамі Саюзу толькі 133 аб'яднаньні: у іх знаходзіцца 25.270 гэктараў плошчы падлягаючай мэліярацыі, на ёй капэравана 8.435 сялянскіх двароў, што складае 15% ад плошчы і 16% ад ліку членаў усёй мэліярацыйнай сеткі Рэспублікі. Пры экстэнсіўнай асушцы ўжывалася павярхоўнае палепшаньне, а пры

інтэнсіўнай грунтоўнае. За мінулы год з 133 таварыстваў, якія лічацца ў сыстэме с.-г. капэрацыі, ёсьць данныя аб працы па 114 таварыствах у акругах Гомельскай і Аршанскай. Агульная каштоўнасьць зробленай імі працы складае 155.084 руб. па Гомельскай акрузе і 3.673 р. па Аршанскай, а ўсяго 158.757 руб., пры чым у гэту суму ўваходзіць асабісты труд і затрачаныя сродкі ў разьмеры 135.369 руб. Цыфры паказваюць, што Гомельская акруга па разьмеру праробленых мераприёмстваў стаіць далёка вышэй чым Аршанская; гэта шырокае разьвіцьцё работы мэліярацыйных таварыстваў у Гомельскай акрузе тлумачыцца некаторай наладжанасьцю работы ў сыстэме с.-г. капэрацыі. Адсутнасьць арганізацыйнага абслугоўваньня па лініі с.-г. капэрацыі ў іншых акругах затрымлівае тэмп разьвіцьця мэліярацыйных таварыстваў, асабліва работу па культуртэхніцы. Апроч балотнага лугавога інвентару пракатных пунктаў Мэліязема асобныя таварыствы набылі неабходны ім інвентар праз Цэнтраземсклад за свой кошт, так з 114 таварыстваў маюць наступны ўласны інвентар: плугоў—9, барон спрунжыновых—2, дзіскавых—27, лугавых барон—11 і адзін каток. Снабжэньне насеньнем і штучным угнаеньнем мэліярацыйных таварыстваў утваралася Цэнтраземскладам, а ў Гомельскай акрузе і Палессельсаюзам; мэліяруемая плошча скарыстоўваецца таварыствамі ў большасьці індывідуальна.

Па справаздачных даных садова-агародныя таварыствы маюць у сваім карыстаньні ўласнай садовай плошчы 875 дзесяцін і заарандаванай 327 дзесяцін, усяго 1.202 дзесяціны, агароднай зямлі ўласнай 163 дзес.; заарандаванай 23 дз.—усяго 186 дзес.; на таварыства саду прыходзіцца 44,5 дзес. і агароду 6,8 дзес., ува ўсіх садох налічваецца 113.040 пладаносных дрэў, што дае 177 дрэў на дзесяціну. Пры таварыствах ёсьць пладовыя пітомнікі, з агульнай плошчай 17 дзес., але пітомнікі дробныя і ня носяць прамысловага характару. За 1926-27 г. атрымана ўраджаю ад садоў 652.163 пуд. і агародаў—33.570 пуд. рэалізавана прадукцыі садоў праз Саюз усяго 8,2%, астатнія праз дзяржворганы і прыватных асоб. Гэта гаворыць аб тым, што праца гэтых таварыстваў да гэтага часу зусім ня ўвязана з саюзамі, што саюзы амаль што зусім не займаюцца яшчэ да гэтага часу збытам садова-агароднай прадукцыі.

Данныя па пчалярных таварыствах прадстаўлены Магілеўскім Саюзам па 12 аб'яднаньням, Бабруйскім і Менскім па 2, усяго па 14. Таварыствы маюць у капэрацыйным карыстаньні 8.514 вульлёў, што дае на адно аб'яднаньне 608 вульлёў. Пры двух таварыствах ёсьць па аднэй паказальнай пасецы. За год таварыствамі загатоўлена мёду на суму 46.230 руб. і воску на 20.000 руб., што дае на адно таварыства ў сярэднім 4.700 р. Адно з таварыстваў Магілеўскай акругі займаецца вырабам вульлёў; за год імі выраблена 118 вульлёў. Таварыства Магілеўскай акругі ў сваёй гаспадарчай дзейнасьці зьвязаны пераважна з Саюзам, а ў астатніх акругах работа з Саюзамі не вядзецца. Як агульнае зьявішча, існуючыя і цяпер пчалярныя таварыствы не ажыцьцяўляюць яшчэ поўнасьцю тых задач, якія стаяць перад імі, у сэнсе ўтварэньня арцельных пасек, барацьбы з заразнымі хваробамі пчол, арганізацыі падкормачных фондаў і інш. Работа па пераводу пчол з калодных вульлёў на рамачныя яшчэ досыць, не разгорнута і калодныя вульлі яшчэ значнае мейсца займаюць у агульным ліку капэрыраваных вульлёў. У некаторых акругах пчалярныя таварыствы арганізаваліся і працуюць з вялікім радыусам абслугоўваньня, што не давала ім магчымасьці мець належны нагляд за работаю сваіх членаў і ў належнай меры іх абслугоўваць.

Частковыя данныя аб працы насенаводных таварыстваў паказваюць, што насенаводныя таварыствы вядуць работу па вырашчываньню чыстасортнага насеньня, закупцы яго на старане і снабжэньню сваіх членаў; абагуленных зямельных плошчаў для абагуленага засева няма, засеў насеньня ўтвараецца кожнай гаспадаркай асобна, уборка, абмалот і хаваньне насеньня ўтвараецца таксама кожнай гаспадаркай індывідуальна. У мінулым годзе 5-ю таварыствамі было засеяна рознага насеньня 702 гэктары зямлі, што дае на адно таварыства 140 гэктараў, плошча засеву супроць мінулага году павялічылася на 32%: разводзілася насеньне канюшыны, аўсу, ячменю, серадэлы, вікі і лубіну. Пры таварыствах маюцца наступныя машыны: трыер – 1, кускута – 1, сартыроўкі—3, сеялкі—2, жняяркі – 1, акучнікаў „Планет"—2, конных грабель—1, малатарня—1 і спружыновак—5. Прыведзеныя цыфры паказваюць, што насенаводныя таварыствы ў параўнаньні з машыннымі больш поўна забясьпечаны машынамі, і больш дасканальнага тыпу, карыстаньне-ж машынамі ня мае абагуленага характару, гэтымі 5-ю таварыствамі ачышчана насеньня: аўса 5.888 п., ячменю 2.284 п., пшаніцы 810 п., канюшыны 48 п. усяго 8.406 п., нагрузка на адно таварыства 2.820 пуд.

Грашовае становішча сеткі па справаздачных матарыялах характарызуецца гэтак: балянс с.-г. крэдытных таварыстваў на 1-1926 г. выражаўся ў суме 7.842.000 руб. а на I-X—27 г. 15.213.000 руб.; свае капіталы на I-X—26 г. складалі 1.228.000 руб. альбо 15,7% к балянсу, а на I-X—27 г. 2.625.000 руб. альбо 21% к балянсу. Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што грашовае становішча крэдытнае сеткі некалькі палепшылася, хоць мабілізацыя капіталу ўсё-ж такі ідзе слаба. Што-ж датычыцца грашовага становішча астатніх відаў нізавой сеткі с.-г. каапэрацыі, дык яно наогул зьяўляецца вельмі напружанае, свае сродкі ў балянсе займаюць вельмі нязначнае мейсца і яна працуе амаль што выключна на пазычковыя сродкі. Вось прыблізна становішча, у якім знаходзіцца пярвічная сетка с.-г. капэрацыі і тая праца, якая ёю праводзілася ў справаздачным 1926-27 годзе; сюды не ўваходзіць толькі праца каляктыўных гаспадарак і для поўнай карціны характэрыстыкі сыстэмы я павінен прывесьці некалькі лічбаў і аб становішчы калгасаў.

На 1-е кастрычніка 1927 г. уся сетка калгасаў складаецца з 416 гаспадарак, з іх камун 48, с.-г. арцеляў 292 і т-ваў па супольнай апрацоўцы зямлі 76, самы большы процант каляктыўных гаспадарак выпадае на Магілеўскую акругу, дзе налічваецца 92 адзінкі і найменшы процант выпадае на Мазырскую акругу, дзе ўсяго 24 калгасы, акрамя вышэйпаказаных 416 калгасаў ужо ў гэтым годзе з'арганізавана блізка 50. Зямельная плошча, якая знаходзіцца ў карыстаньні калгасаў, складае 57.100 гэктараў, з яе ўдобнай зямлі 94,7% і няўдобнай 5,3%, земляўпарадкаваных каляктыўных гаспадарак на 1-е кастрычніка 1927 г.— блізка 80%, атрымалі-ж пляны на зямельныя вучасткі толькі 44% земляўпарадкаваных каляктывы; астатнія гэтых плянаў пакуль што ад зямельных органаў не атрымалі.

Гаспадарчае ўпарадкаваньне зямельнай тэрыторыі калгасаў з увядзеньнем правільных севазваротаў праведзена толькі ў 77%, арганізацыйна-перспэктыўныя пляны маюць толькі блізка 10% усіх калгасаў, што-ж датычыцца вытворчых плянаў, дык у мінулым годзе мелі толькі 29% усіх гаспадарак, у гэтым годзе, дзякуючы таму, што арганізаваны сэкцыі калгасаў, як у цэнтры, так і ў вакругах, якія ў гэтым напрамку вядуць сваю працу, ужо складзены вытворчыя пляны больш як у 80% гаспадарках. Насельніцтва калгасаў складае 21.330 едакоў,

нацыянальны склад насельніцтва калгасаў наступны: беларусоў—65%, яўрэяў—28%, палякаў—4%, рускіх—1%, астатнія іншых нацыянальнасьцяй. Пададзеныя лічбы па землязабясьпечанасьці гавораць аб тым, што апошняя ў калгасах дастатковая; чарговая-ж задача тых калгасаў, якія не даўкамплектованы трэба чым хутчэй прарабіць гэта.

З матар'ялаў відаць, што будынкамі як жылымі так і надворнымі калгасы забясьпечаны слаба і тыя, якімі яны карыстаюцца (яшчэ пазасгаўшыя ад памешчыкаў) да сучаснага моманту, без капітальнага іх рамонту і папаўненьня для карыстаньня мала годныя.

Забясьпячэньне рабочым і падсобным быдлам таксама ў калгасах нізкае, падсобным калгасы забясьпечаны ўсяго на 50%, а цягавой сілай на 80%; мы лічым што патрэбна мець на 8 гэктараў аднаго каня, у той час як у калгасах маецца на 10 гэктараў 1 конь. Дробным с. г. інвентаром калгасы амаль што забясьпечаны, што-ж датычацца больш складаных с.-г. машын, дык тут справа таксама ня важна,—большасьць калгасаў імі яшчэ не карыстаецца. Тлумачыцца гэта ў частцы тым, што адна група калгасаў зьяўляецца дробнаю і скарыстаць складаныя машыны ня могуць, а другая з іх нядаўна арганізаваных за адсутнасьцю сродкаў не змагла яшчэ набыць. Апошнім патрэбна большая дапамога з боку крэдытных устаноў, бо крэдытам да гэтага часу калгасы забясьпечаны так: у сярэднім на кожную гаспадарку прыходзіцца 2980 руб. як бачым сама па сабе і сума нязначная; ёсьць такая думка у некаторых працаўнікоў што калгасы перакрэдытованы, гэта няправільна. Калі разглядзець поўнасьцю іх грашовае становішча, дык мы атрымаем такія вынікі—300 каляктыўных гаспадарак атрымалі крэдыт ў суме 894.000 руб., а сродкі, якія зьяўляюцца гуляюць у грамадзянскім звароце і могуць адказваць за гэты крэдыт, у балянсе займаюць 1.500.000 руб., дык калі гэта разглядаць з боку плацяжуздольнасьці калгасаў, лічыць іх перакрэдытаванымі ніяк ня можна.

Тут з крэдытамі ёсьць другая справа, што часта сродкі калгасамі не пагаспадарчаму скарыстоўваюцца і тады можа быць для гаспадаркі крэдытных устаноў небясьпека ў звароце. Прычыны гэтага няправільнага скарыстоўваньня часткай зьяўляецца неналаджанасьць гаспадарчай працы ў саміх калгасных гаспадарках і, галоўным чынам, тое, што лічбы, якія мы маем на I-X—27 г. паказываюць аб атрыманьні калгасамі 64% кароткатэрміновых пазык і толькі 36% доўгатэрміновых. Галоўныя-ж затраты ў калгасах зьяўляюцца капітальнымі затратамі, на крэдыт калгасы альбо робяць пабудовы, альбо закупляюць быдла, машыны і інш. грунтоўнае абсталяваньне. Кароткатэрміновы крэдыт сябе ў гэтыя тэрміны не акупіць і зьвярнуць яго цяжка; у далейшым памойму ў крэдытаваньні калгасаў срокі крэдыту трэба больш увязываць з гаспадарчай патрэбай, на якую крэдыт даецца; што ж датычыцца цяперашняга становішча, дык гэту запазычнасьць трэба пераглядзець, і там, дзе сродкі затрачаны на грунтоўныя затраты ў гаспадарцы, і дзе яна сябе ў кароткі тэрмін акупіць ня зможа, трэба тэрміны пераглядзець.

Вельмі, дрэнна ў калгасах да гэтага часу з так званымі недзялімымі капіталамі, гэта значыць уласныя капіталы ў членаў калгасаў абагулены яшчэ слаба, за выключэньнем дзяржземаёмасьці, якая па закону дзеляжу не падлягае, свае-ж сродкі членаў калгасаў у недзялімым капіталу займаюць толькі 12%. Працу ў гэтым напрамку трэба надалей весьці больш шпаркім тэмпам. Вось тыя некалькі лічбаў, якія гавораць аб становішчы калгасаў. Наогул калгасы маюць ужо ў сваёй працы цэлы шэраг дасягненьняў, але ў іх працы яшчэ недахопу больш чым дасягненьняў і тут прадстаіць вялікая праца па іх палеп-

шаньню як саміх калгасаў, так і ўсёй сыстэмы с.-г. капэрацыі, асабліва ў зьвязку з апошнімі пастановамі як партыйных, гэтак і савецкіх установ.

Усё вышэйсказанае гаворыць аб тым, што мы ў працы с.-г. капэрацыі маем ужо значныя дасягненьні як па ліку капэраваных сялянскіх гаспадарак, так і па ліку капэрацыйных аб'яднаньняў, значны ўзрост, калі яшчэ прыняць пад увагу што гэта справа ў БССР зьяўляецца зусім новай, што мы ў галіне яе ня мелі ніякага вопыту пакінутага хоць-бы з дарэвалюцыйнага часу, зусім адсутнічалі людзі, якія-б гэту справу вялі раней. Але гэтымі дасягненьнямі быць задаволенымі мы ні ў якім разе ня можам, бо і той тэмп росту с.-г. капэрацыі, а тым больш яе гаспадарчая дзейнасьць зусім не задавальняюць тых патрэб, якія ёй прад'яўляе народная гаспадарка.

З пададзеных намі даных можна бачыць і шэраг адмоўных бакоў у працы с.-г. капэрацыі, яны намі паказаны па кожнай галіне працы і зводзяцца да наступнага.

Калі можна прызнаць рост сеткі ўсіх відаў капэрацыі здавальняючым, дык рост капэраванага насельніцтва, асабліва ў спэцыяльных відах с.-г. капэрацыі зусім слабы, а таму яны яшчэ не зьяўляюцца масавай формай капэрацыі, а ў зьвязку з гэтым і сацыяльны склад пайшчыкаў у іх не адпавядаючы сацыяльнаму складу насельніцтва, бедната капэравана слаба. Гаспадарчая праца ўсіх відаў с.-г. капэрацыі вядзецца дагэтуль так, што яна, галоўным чынам, абслугоўвае адзінаілічныя сялянскія гаспадаркі і за выключэньнем калгасаў яшчэ ў некатарых выпадках машынных таварыстваў, каляктыўная праца не вядзецца. Трэба на далейшае працу ўсіх вытворчых відаў капэрацыі будаваць так, каб праз іх паступова абагульваліся паасобныя галіны гаспадарак сваіх членаў і тым самым вясьці іх паступова да каляктыву.

Грашовае становішча ўсіх відаў с.-г. капэрацыі і асабліва вытворчых вельмі дрэннае, яшчэ да гэтага часу вельмі слаба мабілізаваны сродкі сялянства, трэба паставіць і гэту задачу ў сёлетнім годзе сабраць усе паёвыя ўзносы членаў, вызначаныя статутам, не закрываючы, вядома, інтарэсаў бедняты, якая павінна карыстацца ўсімі ільготамі дадзенымі ёй. Трэба ўсім працаўнікам капэрацыі памятаць, што без дастатковага свайго капіталу, па першае, на пазычковыя сродкі працаваць і цяжка і стратна, а па другое, што капэрацыя дзеля таго і будуецца, каб мабілізаваць для працы ў сельскай гаспадарцы сялянскія сродкі, і тым самым выслабаняць сродкі дзяржавы на пабудову фабрык і заводаў.

Яшчэ і да гэтага часу вельмі дрэнна пастаўлены вучот і справаздачнасьць, а ў капэрацыі, якая зьяўляецца ня простым гандляром, а шырока грамадзкай арганізацыяй і справаздачнасьць яе як перад пайшчыкамі, дык і перад дзяржавай неабходна. Бяз добра наладжанага вучоту і справаздачнасьці працаваць немагчыма, і апроч гэтага капэрацыя павінна працаваць па зараней выпрацаванаму пляну, якім яна павінна кіравацца сама, а таксама дапамагаць дзяржаўным плянавым установам плянаваць народную гаспадарку, а плян бяз вучоту не пабудуеш. Затым трэба ў чым-бы ня было наладзіць вучот і справаздачнасьць, тут павінен быць праведзены цэлы шэраг мерапрыёмстваў як па падрыхтоўцы саміх шчотных працаўнікоў, так і па іх інструктаваньню, але галоўнае тут гэта дысцыпліна самога апарату.

Праводзімая цяпер намі кампанія па загатоўках паказала, што сыстэма с.-г. капэрацыі вельмі слаба вядзе яшчэ гэту працу, у выніку чаго яна, па першае, ня выконвае тых абавязкаў, якія на яе ўскладзены народнай гаспадаркай і дзяржавай і па другое—грашовае

становішча яе дрэннае. Пры невялікіх зваротах яна ня можа акупіць таго апарату, які ёй патрэбен, а капэрацыйная сыстэма паміма апарату гандлёвага павінна мець яшчэ і моцны арганізацыйны апарат, які-б вёў працу як па далейшаму капэраваньню вёскі, дык гэтак і па палепшаньню працы ўжо існуючых капэратываў, а ў іх працы, як мы бачылі, яшчэ больш недахопаў, чымсь дасягненьняў.

Выходзячы з гэтага, трэба працу па загатоўках разгортваць больш шырока і больш шпаркім тэмпам, але ня гледзячы на гэта некаторыя капэратывы яшчэ і да гэтага часу ніякай працы не вядуць: трэба пайшчыкам зварочваць больш увагі на працу праўленьня свайго капэратыву і патрабаваць яе. Нядбайныя адносіны Праўленьня да працы можна канчаткова выжыць толькі праз шырокую масу пайшчыкаў.

Калгаснае будаўніцтва, хоць за апошні час яно і палепшылася, ёсьць вялікая цяга насельніцтва да каляктывізацыі, але да гэтага часу калгасы усё-ж абслугоўваюцца дрэнна. Трэба на гэту галіну працы зьвярнуць больш увагі як самой с.-г. капэрацыі, так і ўсім партыйным арганізацыям; трэба пашырыць інструктаж, падабраць больш працаздольных працаўнікоў у гэтай галіне якія любяць гэту справу. У падборы людзей акруговым саюзам павінны дапамагчы ўсе іншыя арганізацыі.

Вытворчыя віды капэрацыі, якія зьяўляюцца, калі так можна сказаць, падрыхтоўчай групай для калгасаў, да гэтага часу таксама працуюць больш індывідуальна і абслугоўваюцца дрэнна; зямельныя органы да гэтага часу, апроч арганізацыйнай працы па абслугоўваньні гэтых відаў, апроч часам непатрэбнай крытыкі, удзелу ў працы ня прымалі. Інструктарскі-ж апарат саюза невялікі, вельмі слабы, з гэтай справай не спраўляецца і на далей без дапамогі з боку спэцыялістых земорганаў ня справіцца. Апошняй пастановай ЦК КПБ вырашана, што для гэтай справы павінен быць выдзелен у кожным раёне адзін аграном які-б займаўся выключна гэтай працай, гэта дасьць магчымасьць у далейшым палепшыць гаспадарчае абслугоўваньне спэцыяльных відаў вытворчай капэрацыі. Побач з тым акруговым саюзам с.-г. капэрацыі трэба арганізаваць спэцыяльны інструктаж у саюзах для абслугоўваньня гэтых відаў.

Культасьветная праца да гэтага часу па тых справаздачных даных, якія мы маем, амаль што не вялася; трэба яе на далейшае як ва ўсёй сыстэме с.-г. капэрацыі, так і па асобных яе адзінках лічыць сваім абавязкам і вясьці сярод насельніцтва растлумачэньне аб значэньні патрэбнасьці капэрацыі ў сельскай гаспадарцы; трэба працу разгарнуць так, каб усё насельніцтва стала больш менш капэрацыйна пісьменным, бо без уцягненьня ў капэрацыйную працу шырокіх колаў сялянства з іх актыўным удзелам капэрацыя добра працаваць ня зможа.

У апошнюю перавыбарчую кампанію сыстэма досыць значна абнавіла свае кіруючыя органы. Трэба больш шырока цяпер-жа разгарнуць працу з гэтым капэрацыйным актывам па яго перападрыхтоўцы, а праз яго-ж весьці больш шырока культурна асьветную працу сярод астатняга насельніцтва.

Яшчэ і да гэтага часу ў некаторых мейсцах наглядаецца адміністрацыйнае ўмешваньне ў працу с.-г. капэрацыі з боку мяйсцовых савецкіх установаў; трэба гэты нездаровы ўхіл канчаткова зьнішчыць. Капэрацыя ў Савецкай дзяржаве зразумела не зьяўляецца якой-сьці арганізацыяй, якая не залежыць ад другіх установаў, яна вядзе адну-ж і тую працу, якую вядуць нашы дзяржаўныя ўстановы, яна зьяўляецца неад'ёмнай часткаю нашага гаспадарчага і гандлёвага апарату,

але гэта зусім ня значыць, што тут патрэбна адміністрацыйнае ўмешваньне. Ад яе трэба патрабаваць выкананьня тых абавязкаў, якія на яе ўскладзены народнай гаспадаркай і дзяржавай. Разам з тым трэба памятаць, што яна знаходзіцца на гаспадарчым разьліку і што адміністраваньне бяз улічваньня магчымасьці часта пагоршвае і бяз таго дрэннае грашовае становішча, робіць тыя апэрацыі стратнымі.

У сэнсе клясавага падыходу да працы справа ў нас таксама ня ўсюды ў парадку, асабліва калі мы паглядзім на спэцыяльныя віды капэрацыі. Там больш капэрыравана заможная гаспадарка, чымся бедняцкая. Усім капэрацыйным працаўнікам трэба памятаць, што праца капэрацыі ў савецкай дзяржаве на яе палепшаньне павінна расцэньвацца ня толькі з боку таго колькі капэравана сялянскіх гаспадарак, як яны абслужаны, але і з боку сацыяльнага яе складу. Праца з беднатой пастаўлена гэтак, што нават тыя невялічкія фонды, якія выдзелены на капэраваньне беднаты, скарыстоўваюцца не заўсёды правільна, а ў многіх капэратывах яшчэ і да гэтага часу поўнасьцю не скарыстаны. Гэтаму ненармальнаму становішчу ніякага тлумачэньня апроч халатных адносін да справы як з боку саміх капэратываў гэтак і камітэтаў узаемадапамогі і сельсаветаў даць немагчыма. Гэта зьявішча павінна быць рашуча ў бліжэйшы-ж тэрмін зьнішчана.

Трэба палепшыць справу ўцягненьня ў працу жанчын. Як капэрацыйныя ўстановы так і камсамольскія арганізацыі і работнікі жэнаддзелу,—усе да гэтага часу прымалі малы ўдзел у справе капэраваньня жанчын і моладзі. Асабліва трэба зьвярнуць увагу на капэраваньне жанчын у тых відах спэцыяльнай капэрацыі, у галінах якіх у сельскай гаспадарцы займае большае месца жаночы труд.

Усе гэтыя заданьні і цэлы шэраг іншых, з пастаноў XV зьезду ўскладаюць на працаўнікоў с.-г. капэрацыі вельмі вялікую і адказную працу і яны з ёю справяцца толькі ў тым выпадку, калі ім будзе аказана шырокая дапамога ня толькі з боку ўсёй КПБ. Партыя гэту дапамогу дае і ў далейшым будзе даваць, але і з боку ўсіх устаноў, якія працуюць у галіне сельскай гаспадаркі і ўсяго савецкага апарату неабходна прыкласьці ўсю магчымасьць, каб выканаць дырэктывы XV зьезду ЎсеКП(б)Б.

І. Шаліма

Камсамол і барацьба з бюракратызмам

Наш правадыр і настаўнік Уладзімер Ільліч Ленін у студзені м-цы 1923 г. пісаў: „Наш гос. аппарат... в наибольшей степени представляет из себя пережиток старого, в наименьшей степени подвергнутого сколько нибудь серьезным изменениям. Он только слегка подкрашен сверху, а в остальных отношениях является самым типичным старым из нашего старого госаппарата“ (из статьи „Как нам реорганизовать Рабкрин“, том XVIII, ч. 2-я, стр. 112).

Партыя, органы КК-РСІ працуючы над выкананьнем заветаў вялікага настаўніка па палепшаньню дзяржаўнага апарату, прыцягваюць к гэтай рабоце ўсю пралятарскую грамадзкасьць. Камсамол, як бліжэйшы памочнік партыі, павінен быць у першую ча гу зацікаўлены ў справе дапамогі партыі на гэтым галоўнейшым вучастку работы. Камсамол, выхоўваючы ў сваіх шэрагах членаў у камуністычным пралятарскім духу, рыхтуючы будаўнікоў сацыялістычнага грамадзтва, у горадзе ён рыхтуе добра разьвітага ў культурнай і палітычнай адносінах, сьвядомага рабочага для нашай сацыялістычнай прамысловасьці; у вёсцы—сьвядомага каапэратара, грамадаўца, культурнага селяніна. Побач з гэтым ён рыхтуе працаўнікоў для нашага дзяржаўнага савецкага апарату, працаўнікоў, якія могуць, не разводзячы бюрократызму і цяганіны работаць у гэтым сав. апараце, работаць у ім так, каб гэты апарат як мага таньней нам абходзіўся па каштоўнасьці і як мага лепш абслугоўваў рабочага і селяніна.

Адначасова камсамол, выхоўваючы сваіх членаў і беспартыйную рабочую і сялянскую моладзь у духу нязьміронае барацьбы і нянавісьці к бюрократызму, злачынству, цяганіне, фармалізму, накіроўваючы энэргію і інцыятыву моладзі на вылаўліваньне канкрэтных насіцелей зла, павінен растлумачваць, што барацьба з бюрократызмам не заключаецца толькі ў вылаўліваньні асобных бюрократаў, а ёсьць доўгая, упартая работа над спрашчэньнем, выпраўленьнем самой арганізацыі, сыстэмы, мэтадаў работы дзяржаўнага апарату.

Вось мы ў гэтым артыкуле і пастараемся (ставім сабе задачай) разабраць як-жа практычна камсамол Беларусі падышоў да вырашэньня гэтай асноўнай задачы сёняшняга дня.

Прапрацоўка дырэктыў партыі і вышэй стаячых органаў камсамолу праводзілася вельмі энэргічна, асабліва ў той час, калі партыя энэргічна занялася спрашчэньнем цэлага шэрагу ўстаноў і мела ўжо ў гэтай рабоце шэраг станоўчых бакоў і посьпехаў. Праводзілася яна і праз нарады актыву пры камітэтах камсамолу, праз нарады камсамольскіх ячэек гандлёвых і дзяржаўных устаноў у гарадох і нават у саміх ячэйках праводзіліся нарады камсамольцаў, працуючых у гандлёвым апараце і г. д. Гэтыя нарады насілі чыста практычны, дзелавы характар. Бязумоўна, што карысьці ад іх было шмат. Таксама пра-

водзіліся нарады камсамольцаў, працуючых у эканамічных камісіях і эканамічных нарадах, на якіх таксама даваліся добрыя ўказаньні камсамольцам, як у далейшым работаць. На такіх нарадах абгаварвалі пытаньне аб увязцы ўсёй гэтай праводзімай работы з органамі КК-РСІ.

Трэба адзначыць, што гэтае пытаньне, г. з. пытаньне аб практычным удзеле нашай арганізацыі ў праводзімай партыяй рабоце па рацыяналізацыі, спрашчэньні і патаненьні нашага дзяржаўнага і каапэрацыйнага апарату, *не здабыло належнай гастраты ў частцы вытворчых, вясковых і мястэчковых нашых арганізацыях. Тут яно не прапрацована як належыць. Ёсьць некаторыя ячэйкі, асабліва з ліку вясковых, якія зусім аб гэтым і такой дырэктыве нават уяўленьня ня маюць.*

У выніку прапрацоўкі гэтага пытаньня, камсамольская арганізацыя ў *асноўным зразумела значэньне і сутнасьць праводзімай партыяй работы, зразумела і неабходнасьць удзелу ў гэтай рабоце.* Аб гэтым кажуць нам шэраг фактаў практычнага ўдзелу і мерапрыёмстваў праведзеных асобнымі ячэйкамі камсамолу. Вось некаторыя з гэтых прыкладаў.

Па Белсельбанку. Па Інструктарскаму аддзелу зьнішчаны пададдзел статыстыкі, што дае эканоміі ў месяц да 40 руб. У насьценнай газэце выдзелены аддзел пад назвай „рацыяналізіруем", дзе абгаворваюцца ўсе практычныя прапановы, накірованыя к рацыяналізацыі і барацьбе з бюракратызмам.

Па Камунальнаму банку. Камсамольскай ячэйкай павялася актыўная барацьба з момантамі няўважлівых адносін да наведвальнікаў, з грубымі адказамі і спрэчкамі паміж супрацоўнікамі. Утворана ўпарадкаваньне продажу гэрбавых марак, чым выжыты лішнія хаджэньні кліентаў ад стала к сталу і г. д.

Па Дзяржбанку. З прапаноў моладзі па экономпрацы характэрна наступнае: зьнішчаны карткі вэксэледацельству, у выніку—эканомія 2 гадзіны ў дзень. У галіне барацьбы з бюрократычнымі праяўленьнямі гуртком камсамольцаў паднята пытаньне ў насьценнай газэце аб няўважлівых адносінах да наведвальнікаў, аб кантролю бягучых рахункаў і аб тым, што фондавы аддзел работае менш за другія аддзелы і г. д.

Ячэйка ЦСУ (Менск) прарабіла значную працу па ўзмацненьню працоўнай дысцыпліны сярод моладзі і астатніх супрацоўнікаў. Камсамолец Крылавіцкі ўнёс прапанову аб узмацненьні дысцыпліны, праз устанаўленьне кантролю над яўкай на работу і ўходам, і аб устанаўленьні адзінага часу, перапынку, на чай, што дало эканомію прыблізна на 10—12 р. у дзень і г. д.

Усе гэтыя практычныя прыклады сьведчаць і гавораць нам аб тым, што камсамольскія ячэйкі пры савецкіх, гаспадарчых і каапэратыўных установах ужо *ў некаторай ступені ўцягнуты ў гэтую работу і маюць практычныя вынікі свайго ўдзелу.* Гэтакіх ячэек, асабліва асобных камсамольцаў, якія добра ўдзельнічаюць у эканамічных камісіях і нарадах, уносяць шэраг добрых і каштоўных прапаноў ёсьць значная колькасьць. Бязумоўна, што гэта ўсё ёсьць зачынаньні. Гэта кветкі. Усяго гэтага яшчэ мала. Ёсьць бязумоўна некаторыя ячэйкі, якія вельмі мала зрабілі ў гэтых адносінах. Асабліва мала зроблена як у сэнсе растлумачэньня гушчам моладзі і дарослым, практычнай неабходнасьці у гэтым удзельнічаць, і каб што-небудзь нягоднага, бюрократычнага выганяць з нашага апарату, ячэйкамі мястэчкавымі, якія добра ведаюць структуру, датыркаюцца да работы нашых раёных

установ. Таксама можна заўважыць, што нічога ня зроблена ячэйкамі савецкага тыпу нашага чыгуначнага транспарту. А цяганіны і ўселякага роду другіх яскрава-бюрократычных перакручваньняў мы тут можам наглядаць больш, чым дзе небудзь у іншым месцы.

Вялікі недахоп камсамольскай арганізацыі, які трэба аднесьці к гэтай рабоце, гэта тое, *што большасьць з вышэй пералічаных прыкладаў зьяўляецца здабыцьцём асобных камсамольцаў, а не ячэйкі ЛКСМ у цэлым.* Вельмі рэдка бываюць выпадкі, калі тая ці іншая дзелавая прапанова камсамольца папярэдня абгаварваецца на бюро, ці на сходзе ячэйкі. У большасьці выпадкаў камсамольцы ўносяць гэтыя прапановы ў эканомкамісіі, нарады, самі сабою. Няма яшчэ дастатковай арганізаванасьці і ўдзелу камсамольскіх ячэек у гэтай рабоце і не прыцягнуты ў дастатковай ступені спэцыялістыя для прапрацоўкі пытаньняў рацыяналізацыі і спрашчэньня апарату. Яшчэ зусім слабы і нават у некаторых мясцох зусім няма вучоту асобных зачынаньняў і мерапрыемстваў, праводзімых камсамольцамі як у саміх ячэйках, так і ў камітэтах саюзу. Зусім няма перадачы вопыту гэтай работы з аднэй ячэкі ў другую, кепска высьвятляюцца ячэйкамі лепшыя ўзоры работы па гэтых пытаньнях у нашым друку.

Трэба таксама адзначыць наліччa шэрагу фактаў незразуменьня ролі камсамолу як масавай грамадзка-палітычнай арганізацыі рабоча-сялянскай моладзі ў гэтай цяжкай рабоце. Дзякуючы таму, што дырэктывы партыі дрэнна прапрацованы ў некаторых ячэйках, іншага разу ёсьць такога роду настроі і заявы, з боку асобных камсамольцаў, „што рацыяналізацыя апарату—гэта справа самой адміністрацыі, а не камсамольцаў“, альбо—„Нам няма чаго рабіць, бо гэта ёсьць справа партыі“, альбо яшчэ „Нашто спрашчаць, рацыяналізіраваць, калі можаш зрацыяналізіраваць сам сябе“. Бязумоўна супроць такіх настрояў, настрояў чужых грамадзка-палітычнай арганізацыі рабоча-сялянскай моладзі—камсамол павінен весьці самую рашучую барацьбу. *Бо камсамол ня можа быць простым наглядальнікам у гэтай галоўнейшай справе. Камсамол павінен быць, як мы ўжо вышэй заўважвалі, актыўным правадыром ідэй партыі ва ўстанове, любым апараце і г. д., павінен быць ініцыятарам у гэтай справе.*

Яшчэ прыкмячаюцца ў некаторых мяйсцох асобныя моманты боязкасьці камсамольцаў удзельнічаць у рабоце па рацыяналізацыі апарату па прычыне сваіх асабовых інтарэсаў—„Баюся, каб не скарацілі самога за ўдзел у рацыяналізацыі“. А трэба сказаць, што асобныя выпадкі (спробы), былі. Такіх заяў, вядома, вельмі мала. І апошні недахоп заключаецца ў слабым штодзенным кіраўніцтве сыстэматычнай работай па рацыяналізацыі апарату. Гэта работа яшчэ не ўвайшла ў сыстэму, не атрымала такога права „грамадзянства“ і ўдзельнай вагі, як усе астатнія бакі нашай саюзнай работы. Яна яшчэ ідзе ў нас *прылівамі і адлівамі.* Няма яшчэ ў нас такіх гібкіх форм і мэтадаў для паглыбленьня гэтай работы, слаба выкарыстоўваюцца насьценныя газэты, слаба яшчэ працуем у эканамічных камісіях і нарадах, ня створана яшчэ належная грамадзкасьць і г. д. Вось прыблізна, які вынік мы можам зрабіць на грунце некаторых матар'ялаў, якімі мы карыстаемся.

Дзеля таго, каб работу па спрашчэньню і патаненьню дзярж. апарату і барацьбу з бюрократызмам, арганізацыя комсамолу праводзіла добра, без усялякіх хібаў, неабходна самая найлепшая, найшчыльнейшая сувязь і самы строгі кантроль над гэтай работай, з боку органаў КК-РСІ. За апошні час сувязь, удзел і дапамога камсамольскіх

арганізацый і камітэтаў у справе органаў КК-РСІ пачынае паляпшацца. Маюцца практычныя дасягненьні, хаця трэба прызнаць, яны яшчэ далёка недастатковыя. Так, напрыклад, Менскі Акругкамол на склікаsuccную нараду савецкіх камсамольскіх ячэек, для абгаварэньня пытаньняў барацьбы з бюракратызмам прыцягнуў да ўдзелу прадстаўнікоў НК РСІ і АКК РСІ, якія актыўна ўдзельнічалі. Таксама камсамольцы яшчэ кепска працуюць у сэксыях РСІ Гарсавету. Напрыклад, Віцебскі АК паведамляе: „Асабліва рэальных дасягненьняў у гэтай рабоце мы ня маем. Камсамольцы члены Гарсавету ў работу сэкцыі РСІ ўцягнуты недастаткова, за выключэньнем 5—6 т. т., якія актыўна ўдзельнічаюць у рабоце сэкцыі РСІ і што небудзь ды робяць. Зараз узьнята пытаньне аб прымацаваньні камсамольцаў". Такое самае становішча мы можам сустрэць і па другіх гарадох. Гэтыя факты сьцьвярджаюць вышэй сказанае азначэньне і мы можам зазначыць, што форма далучэньня камсамольцаў да работы ў сэкцыях РСІ Гарсаветаў слаба ў нас практыкавалася. А калі дзе небудзь і практыкавалася, дык пачатая справа не даводзілася да канца, г. з. далучаць далучалі, зразу давалі зарадку, а пасьля далучаныя т. т. заставаліся бяз уселякай дапамогі і кіраўніцтва. Гэта быў і ёсьць яшчэ зараз асноўны недахоп нашай арганізацыі работы ў гэтай галіне.

Належыць адзначыць вялізную ролю арганізацыі ЛКСМ у арыентыроўцы і групаваньні ўвагі на пытаньнях неабходнасьці барацьбы з бюракратычнымі зьявішчамі, цяганінай, разгільдзяйствам, палепшаньнем дзяржапарату,—якую адыграла наша „газэтка" „*Чырвоная Зьмена*". Яна мае вялізны, жыцьцёвы вопыт у гэтым пытаньні.

Залог пасьпяховага і правідловага ўдзелу мас камсамолу ў данай важнай справе ёсьць правідловае выкарыстоўваньне энэргіі мас рабоча-селянскай моладзі той нянавісьці, якая існуе ў адносінах да бюракратызму, цяганіны і г. д. у самой гушчы. Практычна-ж неабходна загастрыць у далейшым увагу камсамольскай арганізацыі на наступнае: пашыраць, паглыбляць існуючую сувязь камсамолу з органамі КК-РСІ, якія прызваны ў першую чаргу кіраваць і заклікаць масы на барацьбу з язвай бюрократызму; далучыць у парадку дабрахвотнага прынцыпу шэраг камсамольцаў для работы ў сэкцыях РСІ Гарсаветаў. Трэба сыстэматычна кіраваць імі і дапамагаць ім. Асабліва неабходна мясцовым арганізацыям к гэтай рабоце прыцягнуць камсамольцаў-студэнтаў, большасьць якіх складаюць пераросткі ў камсамоле і якія ня могуць часам выкарыстоўваць сваёй энэргіі на іншай рабоце. Ячэйкі, асабліва савецкія, павінны прапрацаваць творы т. Леніна па пытаньнях барацьбы з бюрократызмам, а іменна: „як нам рэарганізаваць Рабкрын", „Лепш менш, да лепш".

Трэба зразумець усім нашым ячэйкам і камсамольцам, што залогам у пасьпяховым пераможаньні гэтага злу, зьяўляецца ўцягненьне шырокіх рабочых і сялянскіх гушчаў у барацьбу за выкарчаваньне бюракратызму, цяганіны і г. д.

Апошняе пытаньне, якое хачу высунуць і на якім я хачу згрупаваць увагу партыйнай і камсамольскай арганізацыі—гэта пытаньне барацьбы з бюракратычнымі перакручваньнямі, што наглядаюцца ў камсамольскім апараце, і асабліва на пытаньні аб патаненьні яго і спрашчэньні структуры і работы. Бязумоўна, бюрократызм гэта такая няпрыкметная для простага вока-рэч, болька, мікроба, разьядаючая наш апарат, яна пралазіць ува ўсе шчылінкі, іншага разу самым няпрыкметным чынам; ды к таму-ж падчас сыстэма нашай работы, структура апарату садзейнічае яго разьвіцьцю абы ў якой форме.

Уладзімер Ільліч яшчэ ў 1922 г. ў сваёй прамове на фракцыі Усерасейскага зьезду саюзу Мэталістых, гаворачы пра нашу сыстэму работы і нашае кіраўніцтва сказаў: „... Мы, действительно, находимся в положении людей—и надо сказать, что положение очень глупое,—которые все заседают, составляют комиссии, составляют планы—до бесконечности“. І далей „Достаточно посмотреть на нас, как мы заседаем, как мы работаем в комиссиях, чтобы сказать, что старый Обломов остался, и надо его долго мыть, чистить, трепать и драть, чтобы какой-нибудь толк вышел“. (Н. Ленин, том XVIII, ч. 2, стр. 14, ГИЗ, 1925 г.). Я думаю, што і зараз гэта азначэньне цалкам падыходзіць да нас. Сучасная сыстэма кіраўніцтва ў камсамоле, з яго памножанымі камісіямі і падкамісіямі, паседжаньнямі і нарадамі даводзячымі актывістага камсамольца да адурэньня, апроч таго, што яно падчас нездавальняе ўзросшых камсамольскіх мас, але яно г. з гэта сыстэма кіраўніцтва настолькі пераблытана і дзе так многа папяровай цяганіны, што ўсё ў канечным ліку вырастае ў асобныя віды бюракратызму. Фактаў сьцьвярджаючых гэта многа. Я не хачу гэтым сказаць, што быццам нашае кіраўніцтва зусім нікчэмнае, што шмат бюракратызму разьвялося ў камсамольскіх апаратах і г. д., наадварот, мы вельмі многа зрабілі ў сэнсе выкарчаваньня бюракратызму ў савецкім апараце і многа ёсьць прыкладаў, у тысячы разоў больш станоўчых (дадатных) чым адмоўных. Мы скарацілі вельмі многа непатрэбнай пісаніны (у 1926 г. Ц-Камітэтам пасланы цыркуляраў 140, а ў 27 г. - 72 абежнікі), скарацілі на многа каштоўнасьць нашага камсамольскага апарату, спросьцілі шмат галін нашай работы. Але ўсяго гэтага мала. Гэтак хоць-бы ўзяць да прыкладу апарат ЦК ЛКСМБ, дзе існуюць эканамічны аддзел і школьны. Гэтыя два аддзелы займаюцца аднымі і тымі-ж справамі і пытаньнямі, адзін аднаму падчас перашкаджаюць і г. д. Лічу патрэбным сфармаваць іх у адзін аддзел *па працы і адукацыі рабочай моладзі.* Гэты факт узяты, як прыклад. Такіх падобных спраў знойдзеш многа ня толькі ў апараце ЦК, але і ў акругах, раёнах і г. д., трэба толькі над гэтым добра падумаць, абмеркаваць толкам, ня робячы перагібу ў другі бок, як гэта ёсьць у некаторых т.т., бо калі мы зробім перагіб у бок занадтага скарачэньня апарату і ўселякага роду камісій, паседжаньняў і нарад, дык мы можам хутка дакаціцца да адзінаначалія, што безумоўна можа прывесьці да адрыву ад мас, а там і к пэўнаму выраджэньню ў бюрократычную форму.

Узяць іншы прыклад, аб нашых указаньнях і дырэктывах. Даецца, скажам, указаньне па тым ці іншым пытаньні арганізацыі. Дзе ЦК УсеЛКСМ, дае абежнік ЦК ЛКСМБ (як-жа ня даць), дае акругкамол, дае райком і парт. ячэйка. У выніку на галаву ячэйкі падае 5 абежнікаў. Выконвай як хочаш. Дырэктыў вельмі многа, а выконваць трэба толькі аднэй ячэйцы. Я лічу, што ў такіх справах нам патрэбен асноўны ўпор рабіць на практычную дапамогу, жыцьцёвую арганізацыю справы ў самой ячэйцы.

Альбо, вось яшчэ прыклад.

3. Кнігагандлёвым арганізацыям стварыць сталы кадр кніжных працаўнікоў, якіх і замацаваць на гэтай рабоце, унікаючы ад перакідкі іх на іншую работу. Для павышэньня кваліфікацыі кніжных працаўнікоў, прапанаваць Белкоопсаюзу ў бліжэйшы час (не далей лета бягучага году) арганізаваць нарады курсы па падрыхтоўцы кнігагандлёвых працаўнікоў, прыцягнуўшы да ўдзелу ў гэтай справе Белдзяржвыдавецтва і выдавецтва РСФСР.

4. Лічыць абавязковым рашучае пашырэньне кнігагандлёвай сеткі ў вёсцы з паступовай перадачай рэшткі нізавой сеткі Белдзяржвыдавецтва каапэрацыі. Каапэрацыі і БДВ стварыць спрыяючыя ўмовы для кнігагандлю шляхам адшуканьня адпаведных памяшканьняў, пабудовы кніжных шафаў і г. д.

5. Даручыць Камітэту па Справах Друку прыняць рашучыя меры да ўкарачэньня тэрміну і сваечасовага выданьня Белдзяржвыдавецтвам кніжок наогул і кампанейскай і вучэбнай літаратуры асабліва.

6. Белдзяржвыдавецтву прыняць крокі да пашырэньня выданьня масавай папулярнай літаратуры, як на беларускай мове, так і на мове нацменшасьцяй узгодніваючы апошнія выданьні з Цэнтравыдавецтвам, каб ня было паралельных выданьняў. Камітэту па справах друку ў месячны тэрмін праверыць калькуляцыю і накладныя выдаткі Белдзяржвыдавецтва ў мэтах патаненьня масавай літаратуры і далажыць на Бюро ЦК.

7. Даручыць Камітэту па справах друку распрацаваць пытаньні аб пашырэньні выданьня дзіцячай літаратуры на мовах усіх нацыянальнасьцяў БССР і максымальнага яе патаненьня.

8. Даручыць Камітэту па справах друку ў месячны тэрмін распрацаваць мерапрыемствы, забясьпечваючы крэдытаваньне кніжнага гандлю каапэрацыі, як за рахунак спажывецкіх таварыстваў, так і інш. і ўнесьці на зацьвярджэньне ЭКОСО.

9. Кнігандлёвым установам на вёсцы прыцягваць да справы распаўсюджваньня кнігі мясцовыя і культурныя ўстановы, паасобных культурных працаўнікоў і вясковых актывістых.

10. Камітэту па Справах Друку сыстэматычна і пільна сачыць за прасоўваньнем кніжкі наогул, асабліва беларускай у вёску, вывучаць працэс прасоўваньня кнігі своечасова ставіць у ЦК прапановы аб паляпшэньні гэтай справы.

11. Заслухаць даклад Камітэта па справах друку праз тры месяцы аб становішчы справы распаўсюджваньня кніг сярод мас.

12. Даручыць АПА і Аддзелу Друку разам з Белдзяржвыдавецтвам разработаць пытаньне аб выданьні масавай папулярнай тэхнічнай літаратуры на беларускай мове.

Рэзалюцыя Бюро ЦК КП(б)Б аб становішчы і працы калектыўных гаспадарак па БССР (4/IV—1928 г.)

Бюро ЦК адзначае, што 1926/27 гасп. год зьяўляецца пераломным у сэнсе стабілізацыі і арганізацыйна-гаспадарчага ўзмацненьня існуючай сеткі калгасаў: часткова зьменшылась цякучасьць складу іх насельніцтва; маецца ўзрост новых аб'яднаньняў, некаторае разьвіцьцё інтэнсыўных форм вядзеньня гаспадаркі, частковы ўзрост аграмаджаньня аб'ектаў гаспадаркі і павялічэньне ліку падсобных тэхнічных прадпрыемств.

На падставе арганізацыйнага і гаспадарчага ўзмацненьня калгасаў узрос іх аўтарытэт сярод сялянства і значна павялічылась, асабліва ў апошняе паўгодзьдзе, цяга сялянства к калектыўным формам вядзеньня гаспадаркі.

Аднак, Бюро ЦК лічыць, што маючаеся арганізацыйна-гаспадарчае ўзмацненьне далёка недастатна, галоўным чынам з прычыны слабага кіраўніцтва і арганізацыйна-гаспадарчага абслугоўваньня калгасаў з боку сель.-гасп. каапэрацыі, зямельных ворганаў і нізавых савецкіх і партыйных арганізацый.

Галоўнымі недахопамі ў калгасным будаўніцтве зьяўляюцца:

а) Нерацыянальная арганізацыя працы і вытворчасьці ў калгасах, адсутнасьць чоткай формы аплаты працы, стымулюруючай павялічэньне зацікаўленасьці з боку асобных членаў у падняцьці вытворчасьці і кваліфікацыі, у сувязі з чым мае месца нізкая вытворчасьць працы і неналаджанасьць у значнай частцы калгасаў унутраных узаемаадносін.

Налічча дробных калгасаў і адсутнасьць работы па іх узбуйненьню; недастатковасьць работы па спэцыялізацыі гаспадарак калгасаў, адсутнасьць пэрспэктыўных арганізацыйных плянаў, а ў сувязі з гэтым дрэнная якасьць вытворчых плянаў; недастатняя забясьпечанасьць прадукцыйнай жывёлай і ў большасьці нізкая яе якасьць, не наладжан правільны ўход і рацыянальнае кармленьне; нездавальняючая забясьпечанасьць будынкамі ў большасьці калгасаў, асабліва жылымі і зусім слаба праводзіцца рамонт і будаўніцтва новых; нізкая таварнасьць і наогул нізкі яшчэ агрыкультурны ўзровень калгасаў.

в) Маецца яшчэ значная цякучасьць складу насельніцтва калгасаў з прычыны арганізацыйна гаспадарчай неналаджанасьці і адсутнасьці дастатнай увагі камплектаваньню іх. Вельмі нязначная праслойка камуністых і камсамольцаў; ня зьнішчаны выпадкі прымяненьня наёмнай рабочай сілы і ісполынчыны ў паасобных калгасах, прычынай чаму зьяўляецца ў асноўным недаўкамплектаванасьць і дрэнны ўнутраны распарадак.

г) Слабая арганізацыйна-гаспадарчая падрыхтоўка значнай часткі кіраўнікоў (старшынь праўленьня) калгасаў і амаль поўная адсутнасьць работы па іх перападрыхтоўцы.

д) Зусім слабае кіраўніцтва калгасамі з боку сельска-гаспадарчай каапэрацыі і зямельных ворганаў; акруговыя сэкцыі калгасаў з прычыны адсутнасьці неабходных сродкаў і апарату, не зьяўляюцца яшчэ кіруючымі цэнтрамі калгаснага руху і пры сучасным іх становішчы ня змогуць выканаць ускладзеных на іх задач.

Зусім нездавальняючае абслугоўваньне калгасаў з боку раённай агранаміі з прычыны недастатнага вопыту апошняй у калектыўным будаўніцтве і таксама наогул недастатнай увагі гэтай рабоце. Вельмі слабы ахоп сыстэмай каапэрацыі снабжэнчаска-збытавых апэрацый калгасаў (прыблізна па збыту ахоплена 28%, па снабжэньню 47%) і наогул дрэнна наладжана гаспадарчая сувязь калгасаў з сыстэмай сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

Ня гледзячы на ўзмацненьне за апошні час увагі вясковых савецкіх і партыйных арганізацый каляктыўнаму будаўніцтву, усё-жа іх кіраўніцтва калгасамі зьяўляецца далёка недастатным і большай часткі неканкрэтным, а часамі і голае адміністрыраваньне.

ж) Нізкі культурны ўзровень насельніцтва калгасаў, асабліва жанчын, наліччa значнага проценту няпісьменных і малапісьменных; амаль адсутнічае культурнае абслугоўваньне калгасаў з боку палітасьвет установаў раёну і культурна-выхаваўчая работа ў калгасах асабліва сярод жанчын, амаль зусім не вядзецца.

У дапаўненьне і разьвіцьцё пастаноў XV Зьезду УсеКП (б), XI-га Зьезду КП (б) Б і пастановы ЦК УсеКП (б) ад 30 сьнежня 1926 года па каляктыўнаму будаўніцтву, Сакратарыят прапануе:

1. Акругкомам КП (б) Б з адпаведнымі каапэрацыйнымі і зямельнымі арганізацыямі ў 2-х месячны тэрмін праверыць становішча і работу калгасаў і распрацаваць практычныя мерапрыемствы па аздараўленьню і ўзмацненьню іх, а таксама па ўзмацненьню арганізацыйнага кіраўніцтва і абслугоўваньня калгасаў.

2. Акругкомам КП (б) Б і фракцыі Белсельсаюзу ўзмацніць калгасныя сэкцыі ў акругох, павялічыўшы склад інструктароў і палепшыў якасны іх падбор, забясьпечыць сэкцыі калгасаў неабходнымі сродкамі. Побач з адлічэньнямі сыстэмай сельгаскаапэрацыі, даручыць Саўнаркому ў месячны тэрмін вырашыць пытаньне аб дадатковым асыгнаваньні ў бягучым годзе сродкаў на арганізацыйнае абслугоўваньне калгасаў.

Усю работу па кіраўніцтву калгасным рухам згрупаваць у акруговых і цэнтральных сэкцыях калгасаў, узгадніўшы гэтае кіраўніцтва паміж сэкцыямі, земорганамі, камзет і г. д.

3. Улічваючы нізкую агульную, асабліва арганізацыйна-гаспадарчую падрыхтоўку кіраўнікоў калгасаў, фракцыі Белсельсаюзу, Акругкомамі і Райкомам КПБ разгарнуць работу па перападрыхтоўцы актыву калгасаў шляхам арганізацыі курсаў і сыстэматычнага правядзеньня раённых і акруговых нарад па пытаньням каляктыўнага будаўніцтва. Наркамфіну, Наркамасьветы і Наркамзему забясьпечыць асыгнаваньне неабходных сродкаў з будучага году для правядзеньня гэтых мерапрыемстваў.

4. Фракцыі Белсельсаюзу, секцы калгасаў і НКЗ у трохмесячны тэрмін распрацаваць практычныя мерапрыемствы па арганізацыі працы ў калгасах, прадугледзіўшы паміж іншым неабходнасьць падняцьця вытворчасьці працы. Прапановы распрацаваныя па гэтаму пытаньню паставіць на папарэдняе абгаварэньне ў акругкомах КПБ.

5. Фракцыі Белсельсаюзу прыняць рашучыя меры па хутчэйшаму афармленьню уноў арганізаваных калгасаў з тым, каб не затрымліваць з пачатку разгортваньня сельска-гаспадарчых работ, асабліва ў бягучую пасяўную кампанію, сваечасова ствараючы гаспадарчыя ўмовы для іх разьвіцьця. Белсельсаюзу, Райкомам і ячэйкам КПБ больш стала вывучаць арганізуемыя аб'яднаньні, сваечасова папярэджваючы мажлівасьць стварэньня лжэ-калгасаў.

6. Не затрымліваючы ўтварэньне новых дробных калгасаў там, дзе яны будуць мець пэрспэктыву ўзбуйненьня, Белсельсаюзу і Наркамзему праводзіць сыстэматычную работу па паступоваму ўзбуйненьню калгасаў шляхам уцягваньня калгасаў, як аналяючых гаспадарак, так і цэлых пасёлкаў і данадзяленьня іх зямлёй.

7. Даручыць фракцыі Белсельсаюзу прыняць рашучыя крокі, каб у гэтым-жа годзе канчаткова зьнішчыць ісполышчыны, а таксама шляхам даўкамплектаваньня калгасаў, дабіцца поўнай ліквідацыі сталай наёмнай працы ў калгасах.

8. Фракцыям Сельсаюзу і ворганам Наркамзему ў акругах на працягу гэтага году, выходзячы з умоў кожнай каляктыўнай гаспадаркі, устанавіць напрамак іх разьвіцьця, увязаўшы гэта з агульнымі плянамі разьвіцьця народнай гаспададаркі адпаведных раёнаў. Скласьці на працягу 1927/28 і 28/29 г. г. пэрспэктыўныя гаспадарчыя пляны ў кожным каляктыве і ўстанавіць кантроль за іх выкананьнем. Белсельсаюз і Наркамзему безадкладна прыступіць к складаньню 5-цігадовага пэрспэктыўнага пляну каляктыўнага будаўніцтва з тым, каб ён быў уключан у агульны плян разьвіцьця народнай гаспадаркі.

9. У галіне гаспадарчага ўзмацненьня неабходна:

а) дабіцца паляпшэньня якасьці прадукцыйнай жывёлы шляхам больш шпаркага вырашчываньня палепшанай пароды маладняку, а таксама наладзіць правільны ўход і кармленьне стада.

б) Наркамзему прыняць меры к забясьпячэньню каляктыўных гаспадарак лугамі з запасных фондаў. Прыняць да ведама заяву Наркамзему аб тым, што на працягу бягучага году будзе закончана земляўпарадкаваньне існуючых калгасаў, а таксама будуць уключаны ў плян земляўпарадкаваньня ўноў арганізуемыя калгасы.

в) Даручыць фракцыі Белсельсаюзу праверыць выкананьне закону аб перадачы калгасам прамысловых прадпрыемстваў і інакшай маемасьці на тэрыторыі калгасаў і ў выпадку невыкананьня гэтага закону паведаміць ЦКК-РСІ для прыцягненьня да адказнасьці.

г) Улічваючы недастатнасьць тэмпу работы па аграмаджаньні сродкаў вытворчасьці (зямлі, жывёлы, інвэнтару, будынкаў і пад.) і слабае адлічэньне ў недзялімыя капіталы, прапанаваць фракцыям сельгаскаапэрацыі на працягу гэтага году перавесьці ўсе каляктыўныя гаспадаркі на новы статут з устанаўленьнем цьвёрдых норм адлічэньня ў недзялімыя капіталы.

д) Пашырыць будаўніцтва як гаспадарчых, так і жылых будынкаў у калгасах. Сельбанку забясьпечыць Калгасы на гэту мэту крэдытамі. Даручыць Эканомнарадзе безадкладна вырашыць пытаньне аб зьніжэньні проценту і павялічэньні тэрміну крэдытаў на будаўніцтва ў калгасах. Даручыць Наркамзему і сэкцыі калгасаў у 2-хмесячны тэрмін распрацаваць тыпавыя праэкты, як гаспадарчых так і жылых будынкаў.

Наркамзему ўстанавіць першачарговае і ільготнае здавальненьне калгасаў будаўнічым матар'ялам.

е) Даручыць фракцыі Белсельсаюзу распрацаваць да новага ўраджаю канкрэтныя мерапрыемствы па поўнаму ахопу сыстэмай сельгаскаапэрацыі снабжэнчаска-бытавых апэрацый калгасаў.

10. Адзначаючы зусім неразгорнутасьць практыкі групавых аб'яднаньняў калгасаў для сумеснага карыстаньня паасобнымі прадпрыемствамі, складанымі машынамі і аграсіламі, прапанаваць фракцыі Белсельсаюзу практыкаваць такое абслугоўваньне асабліва ў мясцох значнага наліччa калгасаў.

11. Белсельсаюзу разам з Наркамасьветы распрацаваць практычныя мерапрыемствы па правядзеньню палітасьветнай работы ў калгасах.

Рэзалюцыя Бюро ЦК КП(б)Б аб міжнацыянальных адносінах і абслугоўваньні рабочых асобных нацыянальнасьцяў на прадпрыёмствах з пераважнай большасьцю яўрэйскіх рабочых (4 красавіка 1928 г.)

1. Адзначыць, что перавод палітычнай і культурнай работы прадпрыёмстваў з пераважнай часткай яўрэйскіх рабочых (Меншвей, „Прафінтэрн", „Труд", фабрыка панчох і г. д.) на яўрэйскі язык у асноўным сибе апраўдаў, падняў актыўнасьць яўрэйскіх рабочых і даў магчымасьць больш пасьпяховаму ўнядрэньню бальшавіцкай ідэолёгіі ў гушчу яўрэйскіх рабочых данных прадпрыёмстваў (зжываньне бундызму, нацыяналізму, цэхаўшчыны і г. д.).

2. Адзначыць, што ў той час перавод усёй політычнай і культурнай работы на яўрэйскую мову прывяло к паслабленьню палітычнага і культурнага абслугоўваньня не яўрэйскіх рабочых гэтых прадпрыемстваў; паслабленьне іх уцягненьня ў партыю, адрыву ад жыцьця свайго прадпрыемства і г. д.

3. У сувязі з гэтым Бюро лічыць неабходным саблюдаць асобую асьцярожнасьць пры далейшай рабоце па пераводу ўсёй работы партыйнай і проф. арганізацыі на яўрэйскую мову, зусім не зразумелай астатнім рабочым прадпрыёмстваў.

4. У мэтах уцягненьня ўсёй масы рабочых на прадпрыёмствах з пераважным складам яўрэйскіх рабочых і наліччам меншасьці беларускіх, расейскіх і іншых нацыянальнасьцяў рабочых, да актыўнага ўдзелу ва ўсіх відах вытворчай, партыйнай і грамадзкай работы, у мэтах зжываньня наглядаючыхся на прадпрыёмствах тэндэнцый да нацыянальнай абасобленасьці, а часамі і замкнутасьці, у мэтах зжываньня міжнацыянальных трэньняў і праяўленьня антысіметызму, і нарэшце, у мэтах лепшага абслугоўваньня рабочых усіх нацыянальнасьцяў і паляпшэньня іх інтэрнацыянальнага выхаваньня лічыць неабходным:

а) Больш рашучае правядзеньне інтэрнацыяналізацыі складу рабочых на прадпрыёмствах. У тых прадпрыёмствах, дзе да гэтага часу па нацыянальнасьці абсалютна пераважалі яўрэі, пры пашырэньні гэтых прадпрыёмстваў зьвярнуць увагу на ўцягненьне рабочых другіх нацыянальнасьцяў, асабліва беларускай.

З другога боку неабходна прыняць усе меры да больш рашучага выкананьня пастаноў Пленума ЦК КПБ аб унядрэньні яўрэйскіх рабочых у тыя прадпрыемствы і ў тыя галіны прамысловасьці, у якіх да гэтага часу іх лік зусім быў нязначным, альбо дзе яны зусім адсутнічалі (чыгунка і інш.).

Забясьпечыць на прадпрыёмствах з розным нацыянальным складам вырашчываньне актыву з рабочых усіх нацыянальнасьцяў. Для гэтага ў значна большай, чым да гэтага часу меры ўцягваць рабочых усіх нацыянальнасьцяў у склад розных выбарных органаў на прадпрыёмствах.

б) Лічыць немэтазгодным арганізацыю на адным і тым-жа прадпрыёмстве асобных сходаў для рабочых розных нацыянальнасьцяў па аднаму і таму-ж пытаньню.

Адмяніць маючуюся ў некаторых мяйсцох практыку адкрапленьня партыйцаў і камсамольцаў, не разумеючых языка большасьці рабочых данага прадпрыёмства, ад ячэек сваіх прадпрыёмстваў.

в) Пры правядзеньні агульных відаў масавае работы даклады на партыйных і камсамольскіх сходах, а таксама на агульных сходах рабочых і розных грамадзкіх арганіза-

цый рабіць пераважна на беларускай мове, а таксама на яўрэйскай і расейскай з тым, каб у тых выпадках, калі робіцца даклад на яўрэйскай мове, быў-бы забясьпечан пераклад на беларускую, альбо расейскую мову.

Спрэчкі па дакладах павінны вясьціся на розных мовах з тым, каб кожны рабочы мог выказвацца на тэй мове, якая для яго найбольш лёгкая і зразумелая.

г) Пры абслугоўваньні ў культурна-бытавых адносінах рабочых розных нацыянальнасьцяў на іх родных мовах, намеціць як задачу ўзмацненьне вывучэньня беларускае мовы партыйным, камсамольскім і прафэсыянальным актывам, для чаго пашырыць сетку гурткоў па вывучэньню беларускае мовы, больш энергічна распаўсюджваць „Зьвязду" і часопісы на беларускай мове. Даваць артыкулы на беларускай мове ў насьценую газэту і г. д. У яўрэйскіх драматычных і харавых гуртках на прадпрыёмствах з пераважнай большасьцю яўрэйскіх рабочых, вводзіць элементы беларускае мовы і беларускае культуры.

д) У віду нязначнага ўцягненьня ў партыю не яўрэйскай часткі рабочых на прадпрыемствах з абсалютнай большасьцю яўрэйскіх рабочых зьвярнуць больш увагі на ўцягненьне ў партыю гэтай часткі рабочых.

Рэзалюцыя Сакратарыята ЦК КП(б)Б па дакладу Бюро фракцыі КП(б)Б ЦП Саюзу Сельгаслесрабочых аб рабоце сярод спэцыялістых сельскае і лясное гаспадаркі (2 крас. 1928 г.)

Заслухаўшы даклад фракцыі ЦП Саюзу сельска-гасп. і лясных рабочых аб рабоце сярод спэцыялістых сельскай і лясной гаспадаркі, Сакратарыят ЦК КП(б)Б прапануе:

1) Фракцыі Саюзу Сельгаслесрабочых узмацніць палітыка-выхаваўчую работу сярод спэцыялістых шляхам: а) завострываньня на практычных задачах перабудовы вёскі па арганізацыі сацыялістычных форм сельскае гаспадаркі і абслугоўваньню беднаты; б) сыстэматычнае прапрацоўкі на сходах і нарадах спэцыялістых пастаноў партыі, асабліва пастаноў XV Зьезду і лютаўскага Пленуму ЦК КП(б)Б па пытаньнях узмацненьня і перабудовы сельскай гаспадаркі, увязваючы прапрацоўку гэтых пытаньняў з практычнымі мерапрыемствамі па будаўніцтву сельскае гаспадаркі ў БССР.

2) Узмацніць работу фракцыі саюзу па яшчэ большаму ўцягненьню спэцыялістых у практычную, грамадзкую і прафэсыянальную работу, асабліва ў работу вытворчых нарад, увязваючы грамадзкую работу з палітычным і вытворчым выхаваньнем, большым уцягненьнем спэцыялістых у работу агранамічных і каапэрацыйных гурткоў і курсаў для сялян, а таксама агранамічна-асьветную працу нардамоў, хат-чытален і інш. палітасьветных устаноў, увязваючы гэтую работу з выкананьнем імі вытворчых плянавых заданьняў.

3) Фракцыі Саюзу сельск.-гасп. лес. рабочых і органам НКЗ зьвярнуць асаблівую ўвагу на пашырэньне практычнае працы спэцыялістых па арганізацыі і абслугоўваньню калектыўных гаспадарак і беднаты.

4) Арганізаваць сыстэматычную папулярызацыю і распаўсюджваньне на другія акругі і раёны канкрэтных становучых вынікаў асобных спэцыялістых (як-та арганізацыя сялянскіх гаспадарак у розныя калектыўныя аб'яднаньні, пераход на шматпольле, павышэньне ўраджайнасьці, пасеў тэхнічных культур, штучнага пасьбішча, добра арганізаваная агрыкультурная дапамога насельніцтву з боку саўгасаў, правільная арганізацыя і пастаноўка саўгасаў наогул і г. д.) вылучаючы такіх спэцыялістых на больш адказную гаспадарча-тэхнічную і кіраўнічую работу, для чаго фракцыі ЦП саюзу ў сваёй штодзенай прафсаюзнай рабоце выяўляць такіх спэцыялістаў і разам з органамі НКЗ вылучаць і дапамагаць ім у іх працы па паглыбеньню зробленых дасягненьняў.

5) Органам НКЗБ узяць цьвёрды напрамак на замацаваньне на адным месцы работы добра правераных на рабоце спэцыялістых (па практычных выніках іх работы) з разьлікам атрымаць найбольшы эфэкт ад работы апошніх, рашуча адмаўляцца ад частых неабаснаваных перакідак.

6) Фракцыі Саюзу Сельск.-Гасп. Лес. рабочых разам з органамі НКЗ правесьці выхаваўчую і арганізацыйную (упрашчэньне і г. д.) работу па падняцьцю вытворчай дысцыпліны і самой вытворчасьці спэцыялістых.

7) Фракцыя саюзу Сельгаслесрабочых і НКЗ да зацьвярджэньня каштарысаў на 1928-29 г. вывучыць пытаньне аб нормах выпрацоўкі, устаноўленых для асобных катэгорый спэцыялістых (каморнікі, лесаўпарадкаваці, аграномы і інш.) і намеціць практычныя захады па рацыяналізацыі і ўпрашчэньню працэсаў вытворчасьці асобных работ.

8) Рашуча паставіць пытаньне сярод спэцыялістых сельскай і лясной гаспадаркі аб ужываньні ўсімі спэцыялістамі ў сваёй штодзёнай рабоце беларускай мовы.

9) Акругкомам, райкомам і ячэйкам КПБ узмацніць кіраўніцтва работай фракцый саюзу і земорганаў у галіне работы апошніх сярод спэцыялістых.

10) Даручыць фракцыі ЦП Саюза Сел. Гасп. Лес. рабочых на падставе вышэй дадзеных дырэктыў распрацаваць канкрэтныя указаньні аб масавай рабоце сярод паасобных груп спэцыялістых (аграномы, каморнікі, меліяратары, лясныя работнікі).

Прапановы Сакратарыяту ЦК КП(б)Б па пытаньню аб культурнай працы сярод рабочых прыватных прадпрыемстваў (2/IV 1928 г.)

I. Заслухаўшы даклад фракцыі ЦСПСБ аб становішчы культпрацы сярод рабочых прыватных прадпрыемстваў, Сакратарыят ЦК КПБ адзначаючы некаторыя дасягненьні ў гэтай працы, прапануе:

1) Зьвярнуць асаблівую ўвагу на падрыхтоўку і пашырэньне культ. проф. актыву сярод рабочых прыватных прадпрыемстваў, шляхам уцягненьня членаў саюзу ў практычную культ. працу, скліканьня спэцыяльных сходаў проф. актыву, абгаварэньня практычных пытаньняў культ. працы сярод рабочых прыватных прадпрыемстваў, уцягненьня проф. актыву ў паліт. проф. гурткі і г. д.

2) Дабіцца большага ўцягненьня рабочых прыватных прадпрыемстваў у сябры профсаюзных клюбаў і ў культурна-масавую працу профсаюзаў, а таксама пашырыць арганізацыю чырвоных куткоў пры групкомах, палепшыць якасьць іх працы, шляхам простых і зразумелых форм работы (гучныя чыткі газэт, расказаў, работа розных гурткоў, удзел у насьценнай газэце, гутаркі на антырэлігійныя тэмы, вечары пытаньняў і адказаў, вечары самадзейнасьці і інш.).

3) Прымаючы пад увагу недастатковае выяўленьне ў рабоце сярод рабочых прыватных прадпрыемстваў клясавага самапачуцьця,—Сакратарыят ЦК КПБ прапануе праводзіць культурна-масавыя мерапрыемствы пад пунктам погляду клясавага выхаваньня рабочых, выяўленьня існуючых супярэчнасьцяў клясавых інтарэсаў паміж рабочымі прадпрымацелямі.

4) Наладзіць работу па сыстэматычнаму выхаваньню і вылучэньню лепшых т.т. з проф. актыву на профсаюзную работу, у каапэрацыю ў якасьці ўпаўнаважаны, у Гарсавет—дэпутатамі і ў працы сэкцый Гарсаветаў.

5) У адносінах нац. работы сярод гэтых груп, Сакратарыят ЦК КПБ прапануе кіравацца рашэньнямі ЦК аб беларусізацыі профсаюзнай культурнай працы. Неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на растлумачэньне і папулярызацыю рашэньняў партыі, савецкай улады і профсаюзаў па нац. пытаньню, зьбліжэньне асобных нац. груп паміж сабой (арганізацыя інтэрнацыянальных вечароў, гутаркі аб антысэмітызму і інш.).

6) Фракцыям проф. арганізацый і Нар. Кам. Асьветы пры камплектаваньні школ па ліквідацыі няпісьменнасьці і вячэрніх школ для дарослых і моладзі шырэй ахапіць няпісьменных і малапісьменных рабочых, працуючых на прыватных прадпрыемствах як у горадзе, так і ў раёне.

7) Наблізіць да гэтых груп рабочых папулярную кнігу, шляхам выдзяленьня з клюбных бібліатэк спэцыяльных перасовак з падборам найбольш падыходзячай літаратуры, арганізацыі кнігаоства, уцягнуўшы ў гэтую працу актывістаў з іх срады, а таксама завастрыць увагу ўсіх проф. арганізацый аб распаўсюджваньні газэт сярод рабочых прыватных прадпрыемстваў.

8) Зьвярнуць большую ўвагу на ўцягненьне рабочых прыватных прадпрыемстваў ў клюбныя гурткі фізкультуры і арганізацыю груп фізкультурнікаў пры групкомах прыватных прадпрыемстваў, а таксама правядзеньне практычных заняткаў па ваенізацыі.

Рэзалюцыя Сакратарыяту ЦК КП(б)Б па дакладу фракцыі ЦП Саюзу Работнікаў Мастацтва (4/IV—1928 г.)

Заслухаўшы даклад фракцыі ЦП Саюзу Рабмастацтва, Сакратарыят ЦК КП(б)Б адзначае:

1. Агульны ўзрост профактыву і ўцягненьне ў актыўную саюзную працу працаўнікоў мастацка-творчага труда, у прыватнасьці артыстых нацыянальных Дзярж. тэатраў уцягненьне ў кіруючую нізавую проф. работу новых кадраў, асабліва з ліку жанчын—артыстак беларускіх і яўрэйскага Дзярж. Тэатраў.

2. Наглядаючыйся ўзрост зацікаўленасьці з боку кваліфікаванай часткі сяброў саюзу да пытаньняў будаўніцтва новага тэатру, кіно і агульнай палітыкі партыі ў галіне мастацкае культуры, асабліва пасьля тэатральнай нарады пры ЦК УсеКП(б).

3. Палепшаньне працы па культшэфству над Чырвонай Арміяй, як праз тэатры і кіно, так і ў справе непасрэднага абслугоўваньня казармы і дамоў Чырвонай Арміі.

Побач з гэтым Сакратарыят ЦК КПБ адзначае наступныя недахопы:

1) Недастатковае разьвіцё дзейнасьці вытворчых нарад і недастатковы іх уплыў на паляпшэньне рэпэртуару тэатраў, а таксама недастатковае ўцягненьне профсаюзнай масы ў абгаварэньне пытаньня ў рацыяналізацыі, рэжыму эканоміі, плянавасьці і інш.

2) Агульную недастатковасьць увагі вытворчай асьвеце і самаадукацыі, асабліва сярод працаўнікоў клюбаў, некаторых тэатраў і кіно (вытворчыя гурткі, дыспуты, самакрытыка).

3) Слабасьць разьвіцьця грамадзкасьці сярод працаўнікоў мастацтва ў сэнсе набліжэньня іх да рабочых мас праз клюбы (лекцыі, дэманстрацыя паасобных дасягненьняў, грамадзкія паказы, кансультацыйная праца з мастацкімі гурткамі ў рабочых клюбах).

4) Недастатковае правядзеньне працы па растлумачэньню нацпалітыкі партыі і задач работнікаў Мастацтва ў культурным будаўніцтве БССР. Таксама слабасьць работы па беларусізацыі профактыву, у прыватнасьці кінопрацаўнікоў, гурткаводаў рабочых клюбаў, выкладчыкаў і студэнцтва мастацкіх навучальных устаноў.

5) Слабасьць уцягненьня ў саюзную працу тэхнічна абслугоўваючага пэрсаналу тэатраў і недастатковасьць абслугоўваньня іх саюзам.

6) Слабасьць выхаваўчай працы па барацьбе з бытавымі перажыткамі ў тэатрах і сярод актораў перш усяго (пасыўнасьць да грамадзкага жыцьця, барацьба за ролі, групавыя склокі і інш.).

ЦК прапануе:

1. Фракцыі ЦП Саюзу палепшыць якасьць працы па ўцягненьню ў саюзную і грамадзкую працу кваліфікаванай часткі працаўнікоў мастацтва (рэжысэры, мастакі, артыстыя, кампазытары), ствараючы лепшыя спрыяючыя ўмовы іх працы і падтрымоўваючы іх у працы, завострываючы ўвагу вакол ролі і задач мастацтва ў справе культурнае рэвалюцыі.

2. Значна палепшыць работу вытворчых нарад у тэатрах. Практыкаваць абгаварэньне пытаньняў мастацкага характару, на аб'яднаных пасяджэньнях вытворчых камісій і мастацкіх Рад, а таксама практыкуючы вынясеньне пастаноў мастацкіх Рад на абгаварэньне вытворчых нарад. Адначасова з гэтым у галіне рацыяналізацыі, рэжыму эканоміі, правільнага абхопу масавага рабочага глядача і вучоту яго запатрабаваньняў бязьлітасна змагацца з безгаспадарнасьцю, бесплянавасьцю і рутынерствам у рабоце паасобных кіраўнікоў тэатру.

3. Фракцыі ЦП Саюзу больш прыцягваць кіно-працаўнікоў да абгаварэньня дзейнасьці Белдзяржкіно ня толькі з пункту гледжаньня гаспадарнасьці, але і з боку яго сувязі з рабочай грамадзкасьцю (парадак прыёму сцэнарыяў, клюбны пракат, рэкляма, цэны), увязваючы гэту работу з кіно-грамадзкасьцю (ОДСК, рабкораўскія гурткі і інш.).

4. Узмацніць працу ў галіне вытворчае асьветы і самаадукацыі працаўнікоў мастацтва, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на падвышэньне кваліфікацыі гурткавода і кіномэханікаў у рабочых клюбах.

5. Зьвярнуць увагу на значна большае разьвіцьцё грамадзкасьці сярод акторства, пашыраючы іх штодзённую сувязь з рабочымі клюбамі (кансультацыйная праца і інш.).

6. Узмацніць арганізацыйна-масавую працу на прадпрыемствах праз ажыўленьне агульных сходаў.

7. У галіне нац. работы Беларускіх Дзяржтэатраў узмацніць тэмп беларусізацыі, у першую чаргу ўсяго профактыву, разьвіць сетку гурткоў па вывучэньню беларускае літаратуры, мастацтва і гісторыі беларускае культуры, абхопліваючы гэтымі гурткамі працаўнікоў усіх мастацка-відовішчных прадпрыемстваў; практыкаваць наладжваньне вечароў зблізкэньня працаўнікоў мастацтва паасобных нацыянальнасьцяў.

8. Узмацніць працу сярод працаўнікоў Бел. Дзярж. яўрэйскага тэатру, шляхам разьвіцьця сеткі гурткоў па вывучэньню яўрэйскай літаратуры, мастацтва і гісторыі культуры, абхопліваючы гэтымі гурткамі ўсіх працаўнікоў яўрэйскага тэатру.

9. Палепшыць арганізацыйнае і культурнае абслугоўваньне працаўнікоў вясковых кіно-перасовак; зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на палітычнае і культурнае выхаваньне працаўнікоў беларускага вандроўнага тэатру і на іх сувязь з савецкай грамадзкасьцю ў вёсках і мястэчках у часе іх падарожжа.

10. Палепшыць пастаноўку працы па абслугоўваньню беспрацоўных сяброў саюзу, а таксама працуючых у працкалягктывах, больш уцягваючы іх у агульна-саюзную працу і прымаючы меры да падвышэньня іх кваліфікацыі.

11. У зьвязку з слабасьцю партпраслойкі ўва ўсіх мастацкіх прадпрыемствах, у мэтах усіленьня там партыйнага ўплыву, АК забясьпечыць, як афармленьне фракцый акруговых аддзяленьняў Саюзу Рабіс і мясцкомаў буйных прадпрыемстваў, так і самы актыўны ўдзел працаўнікоў АПА Акругкомаў у мастацкіх радах.

12. АПА ЦК узмацніць кіраўніцтва дзяржаўнымі тэатрамі, шляхам больш шчыльнага складаньня рэпэртуару і сыстэматычнага кіраваньня дзейнасьцю Мастацкіх Рад.

13. ЦСПСБ і ЦП Саюзу работнікаў Мастацтва ў найкарацейшы тэрмін правесьці мерапрыемствы па аздараўленьні фінансаў Саюзу.

БІБЛІЯГРАФІЯ

Частный капитал в СССР

(По поводу книги Ларина „Частный капитал в СССР" и книги Кондурушкина „Частный капитал перед советским судом") *Изд. Госиздата 1927 г.*

1. Социалистический сектор народного хозяйства побеждает частно-капиталистический

Ни одна капиталистическая страна не знала и не знает такого быстрого темпа роста народного хозяйства, которое мы имеем, начиная с годов нэп'а. А ведь мы начали наше строительство почти на пустом месте. К началу восстановительного периода валовая прдлукция сельского хозяйства составляла немногим более половины продукции 1913 года, а валовая продукция промышленности—немногим более 1/5 продукции того же года. С этих цифр начинается резкий под'ем всех отраслей народного хозяйства, и в текущем хозяйственном году страна не только должна получить 109% довоенной продукции сельского хозяйства, но имеет возможность вложить в капитальное строительство сельского хозяйства свыше полмиллиарда рублей; продукция промышленности должна составить 115% довоенной, и капитальные вложения в промышленность составляют уже свыше миллиарда рублей.

Советский Союз добился этих крупнейших достижений в борьбе с рядом чрезвычайных трудностей. Эти трудности двоякого рода. Одни трудности вытекают из положения нашей страны, как единственной страны диктатуры пролатариата, живущей в окружении капиталистических стран; внутри страны за время нэп'а относительно развился частный капитал; миллионы мелких, распыленных крестьянских хозяйств лежат тяжелым бременем на нашем развитии. Другие трудности вытекают из нашей некультурности, из несовершенства госаппарата, из неумения, особенно в первые годы нэп'а, торговать и управлять сложным хозяйством. В борьбе с попытками экономической блокады со стороны капиталис ических держав и частным капиталом внутри СССР, улучшая госаппарат, постепенно изменяя социальную природу крестьянского хозяйства. Советы достигли невозможного в капиталистических странах бурного роста народного хозяйства. И дело не только в том, что мы уже перешагнули довоенный уровень развития. Основное заключается в том, „что восстановительный период в условиях диктатуры пролетариата был одновременно и периодом борьбы за усиление в народном хозяйстве роли социалистических элементов, периодом преодоления капиталистических элементов в хозяйстве" (Рыков). Социалистические элементы народного хозяйства вытесняют, побеждают частно-капиталистические.

Перед страной стоят сейчас гораздо более сложные, чем ранее, задачи: на базе восстановленного до довоенного уровня народного хозяйства и консолидации пролетариата превратить Советский Союз из страны аграрно-промышленной в страну промышленно-аграрную, индустриализировать страну, вести колоссальную работу по кооперированию и коллективизации крестьянского хозяйства Ошибочно думать, что эта работа пойдет гладко. Те затруднения, которые были у нас в восстановительном периоде,—одни больше, другие меньше, в тех же самых или других формах,—будут и в новом периоде. Капиталистический мир, к сожалению, еще не обнаружил желания сойти со сцены; отсутствующий под нашим натиском частный капитал маневрирует, приноравливается к новой обстановке и хочет урвать долю из народного хозяйства; госаппарат еще нуждается в серьезных исправлениях его недочетов. Все это—наши враги и враги серьезные. „Изучение своих врагов необходимо не в меньшей степени, чем изучение своей собственной созидательной деятельности" (Ларин). Вот почему в наших условиях значительную ценность представляют материалы, рисующие методы и пути развития частного капитала в СССР. Из имеющейся по этим вопросам богатой литературы надо выделить две работы.—Ларина „Частный капитал в СССР" и Кондурушкина: „Частный капитал перед советским судом". Обе работы дают много ценного цифрового и фактического материала, впервые в систематизированном виде, о работе частного капитала. Между прочим, т. Сталин (в своем докладе на XV с'езде ВКП(б)) положительно отозвался о книге Ларина.

Размер статьи не позволяет детально остановиться на этих книгах, попытаемся поэтому из всего богатого материала, приводимого Лариным и Кондурушкиным, использовать наиболее характерные.

История буржуазного накопления в СССР

К началу новой экономической политики промышленность и товарные фонды были в руках у государства, а рыночная связь ме-

жду отдельными частями народно-хозяйственного организма оказалась у буржуазии. Буржуазия вошла в нэп с капиталом, примерно, в 150 миллионов рублей, нажитым на мошенничестве, спекуляции валютой и т. д.

К 1923 году частный капитал достиг уже 350 миллионов рублей. Конечно, нормальным путем достигнуть такого увеличения за 2 года невозможно. Действительно, буржуазное накопление за эти годы было типично-хищническим, воровским. Ларин говорит, что „история буржуазного накопления в СССР в первый его период есть, прежде всего, история буржуазного воровства в разных видах и формах". В согласии с Лариным, Кондурушкин указывает, что „спекуляция, взятка и хищения—фундамент частной торговли". Перед верховным судом это выявилось с полной очевидностью в ряде процессов.

Другим методом буржуазного накопления была лжегосударственная форма деятельности. Формально тот или иной подрядчик, поставщик состоит на государственной службе, а фактически он—частный предприниматель, состоящий лишь в договорных отношениях с государством. Этот метод был особенно распространен на железнодорожных лесозаготовках, где подрядчики принимались на государственную службу, получали мандаты, ссуды, но действовали самостоятельно и прибыль клали себе в карман, да еще порядочно поднаворовывали.

Методы простого воровства особенно ясны в использовании частниками арендованных предприятий. В первые годы нэпа частникам сдавались в аренду национализированные предприятия с большими старыми неучтенными запасами. Эти запасы беззастенчиво вывозились частниками и зачастую продавались госорганам

Частники наживались на перекупке импортных материалов, на контрабанде и т. д. Частники использовали государственный товарный и денежный кредит всяческими путями (напр., под несуществующие или неработающие предприятия). Частник использовывает об-а взаимного кредита и получает там ссуды в довольно крупных размерах (см. процесс Моск. об-ва взаимн. кред.—газ. „Правда" за апрель с. г.)

Взятка, воровство, околпачивание госорганов.—таковы формы буржуазного накопления в СССР.

Причины, благоприятствовавшие росту частного капитала

Поневоле возникает вопрос, как могло случиться, что в пролетарском государстве частники расхищали государственные богатства. Ответ кроется в том, о чем говорил Владимир Ильич, имея ввиду наш госаппарат: „Машина едет совсем не так, как воображает тот, кто у руля этой машины сидит". В служащие госучреждений попали не только бывшие рядовые чиновники, но и значительная часть оставшейся в СССР буржуазии. Попадали в совучреждения быв. пристава, жандармы, стражники, принимались на службу и такие специалисты, у которых была глубокая связь с вскормившей их буржуазией. Эти люди принесли с собой свои старые навыки, старые методы хищений и взяточничества. Связь служащих госучреждений с буржуазией являлась важнейшей причиной использования госаппарата чуждыми пролетариату элементами.

Такие типы, как быв. миллионер, ленинградский металлоторговец Пляцкий мог ли вновь воскреснуть и вести миллионные операции только благодаря своей агентуре в советском аппарате или крупной взятке (заказы Пляцкого исполнялись быстрее, чем заказы Волховстроя!). За бесхозяйственность, отсутствие учета и т. д. государству пришлось расплачиваться десятками миллионов рублей, попавшими в загребущие руки буржуазии. Эта бесхозяйственность (иногда по неумению, часто злонамеренная) приводила к расхищению грузов вагонами и десятками тысяч пудов Безучетность, безотчетность, бесконтрольность были основными благоприятствующими хищениям обстоятельствами в первый период нэпа и первой базой закрепления и роста частного капитатала" (Кондурушкин).

Частный капитал в промышленности, сельском хозяйстве и торговле

Положение частного капитала к настоящему времени в этих областях работы его сводится в кратких чертах к следующему.

Собственно промышленное производство дает на долю частного капитала 6,4% всей валовой продукции промышленности. Подсчеты Ларина показывают, что на долю лжекооперативов (частного капитала) приходится 2% валовой продукции промышленности. Около 30% валовой продукции сельского кустарничества дает его капиталистически организованная часть, а это значит, что эта область дает частному капиталу 3,3% валовой продукции промышленности. Итого на долю частного капитала приходится около 12% всей валовой продукции промышленности страны. Товарной продукции на долю частного капитала приходится 13%, на долю мелкого частного трудовика - 11%, а всего —24%. В производстве средств потребления, т. е. в части производства, теснее всего связанной с широким рынком, частнику принадлежит 32% товарной продукции, почти 1/3.

На долю капиталистической промышленности (в том числе считая наемных рабочих в лжекооперативах) приходится до 350 тысяч человек. Если к этой цифре добавить 100 тыс. членов лжекооперативов и 400 тыс, (из общего количества в 1.600 тыс.) человек „годовых работников" капиталистически организованной домашней промышленности города и деревни, получим довольно внушительную цифру в 850 тысяч человек, занятых по найму у частного капитала в промышленности и непосредственно частному капиталу подчиненных. Это составляет 18,3% наемной рабочей силы, занятой во всем промышленном производстве страны.

Во всю промышленность страны, гл. образом, в производстве средств потребления частник вложил к середине 1927 г. до 450 миллионов руб., т. е. 5,6% всего капитала, вложенного в промышленность СССР.

Итак, 5,6% капитала, увязанного в промышленности, 18,3% трудовых сил, около 13% товарной продукции—такова доля частного капитала в промышленности. Цифры эти показывают с достаточной ясностью, что „буржуазные надежды на торжество частного капитала в промышленности СССР разлетелись в прах" (Ларин).

В отношении доли частного капитала в сельском хозяйстве. По РСФСР, Украине и БССР действительно капиталистическими можно считать около 2% всех хозяйств Это в громадном большинстве мелкокапиталистические хозяйства, но деяния последнего времени показывают, что в ряде районов создались крупные плантаторские (табачные плантации, огородничество и пр.), зерновые и животноводческие хозяйства, обрабатываемые наемными рабочими. В качестве примеров можно взять отдельные хозяйства, о которых пишет Терский Окружной Комитет партии (Северный Кавказ) в брошюре „Наш опыт". В Наурском районе Терского округа имеется 10 крупных овцеводных хозяйств, размерами от 1½ тысяч до 15 тысяч овец. Один из этих крупных хозяев арендовал под выпас для своих овец 17 тысяч десятин земли в Дагестанской республике.

В хозяйствах у деревенской капиталистической верхушки занято до 1,5 миллионов батраков. Эти 2% всех хозяйств обладают 10—11% всех посевов, около 7,5% рабочего скота, 5,5% рогатого скота 9% валовой продукции сельского хозяйства. Не довольствуясь своими посевами, эта группа прибегает к аренде. Примерно половину аренды надо отнести к капиталистической, имеющей целью производство на рынок, осуществляемое наемными рабочими. Собственные посевы и аренда приносят капиталистической деревенской верхушке до 14% всей товарной продукции сельского хозяйства.

Другая группа капиталистического предпринимательства—это сельско-хозяйственные производственные лжекооперативы. Обследование НК РКИ почти 7000 колхозов показало, что 25% из них—колхозы, под вывеской которых работает частный капитал, т. е. ¼ всей товарной продукции колхозов является капиталистической продукцией, что составляет 1% всей товарной продукции сельского хозяйства. Третья группа—это капиталистическая сдача скота и инвентаря бедняцким хозяйствам, что приносит капиталистам до 4% товарной продукции. Итого на долю капиталистической верхушки деревни приходится до 19% товарной продукции сельского хозяйства. К этому надо прибавить доход от капиталистической организации отхода из деревни (фиктивные „артели" строителей и т. д.), что, по исчислениям тов. Ларина, считая и открытые заказы подрядчикам на строительство, дает частному капиталу до 250 миллионов рублей Такова общая доля частного капитала в сельском хозяйство.

То чего достиг частный капитал в промышленности и сельском хозяйстве, является собственной базой частного капитала для торговли. Не ограничиваясь этим, частный торговый капитал использует капиталистический денежный кредит и в довольно широких размерах пользуется товарным и денежным кредитом государства Частный капитал вступил в 27 год в торговлю с собственным заемным капиталом (не считая государственного кредита) в общей сумме до 900 миллионов рублей, а включая и государственный кредит—с капиталом в 1250 миллионов руб. Сумма, конечно, значительная, но относительно она не велика, составляя менее 20% всех занятых в торговле страны средств. Если вспомнить, что в первые годы нэп'а рыночная связь была, главным образом, в руках у частника, то и здесь, так же как и в промышленности частный капитал отступает перед социалистическим сектором.

Выводы

Мы не использовали и малой доли чрезвычайно интересных материалов Ларина и Кондурушкина, но и те данные, которые были приведены, позволяют сделать ряд выводов, подвести некоторые итоги.

Частный капитал, вступивший в НЭП, можно сказать голеньким, окреп за период НЭП'а Воровские, хищнические формы буржуазного накопления в СССР облегчались нашим неумением работать в условиях рыночного товарооборота, состоянием госаппарата, в значительной части заполненного чуждыми пролетариату и его интересам элементами. Десятки миллионов рублей были дорогой „платой" частному капиталу за учебу. И сейчас еще приходится серьезно бороться с агентами частного капитала в госаппарате; достаточно вспомнить преступления группы шахтинских инженеров, агентов международного и внутреннего капитала. Шахтинское дело показало, как много необходимо еще улучшать госаппарат, аппарат партийных и профсоюзных организаций. Но в общем мы оказались способными учениками. Частный капитал отступает перед социализмом и в области промышленности и в области торговли. Налицо серьезные успехи и в деле перестройки деревни, кооперирования и коллективизации крестьянского хозяйства. Было бы, однако, несерьезно, если бы перед лицом стоящих перед нами больших и сложных задач социалистического строительства народного хозяйства, ограничиться констатированием наших успехов и поражений противника, обладающего большими маневренными способностями. Нельзя забывать, что частный капитал, отогнанный от государственного хозяйства, передвинулся в обслуживание товарооборота между городом и деревней, стал заниматься организацией кустарного произ-

водства, снабжением и сбытом его изделий. Нельзя забывать, что 850 тыс. человек непосредственно подчинено, работает на частный капитал.

Об'явленное XV Всесоюзным С'ездом партии усиление наступления против кулака, нэпмана, частного капитала, стало возможным благодаря достигнутым успехам социалистического сектора народного хозяйства. Это наступление будет тем успешнее, чем менее мы будем обольщаться нашими достижениями, чем более мы будем изучать пути, повадки частного капитала. Разработка ряда серьезных мероприятий в области усиления социалистического строительства в городе и деревне возможны лишь на основе серьезного изучения этапов нашего строительства и особенностей работы частного капитала.

По следам т.т. Ларина и Кондурушкина должны пойти экономисты БССР Они должны дать анализ развития и работы частного капитала в Белоруссии. Такая работа принесла бы несомненную пользу в нашей борьбе с частным капиталом.

М. Г.

ЗЬМЕСТ

НАША ТРЫБУНА

НА МЯСЦОХ

ГІСТПАРТ

У ЦК КП(б)Б

ЦАНА 25 кап.